Сямейная газета



Бяспечныя цацкі выбіраем з экспертам



Як разгледзець у будучым мужы агрэсара?



Рарытэты са склада мэблі «Беларусьфільма»

СТАР. 13

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 КРАСАВІКА 2016 г. ЧАЦВЕР № 69 (28179) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## ЯК ПАДСІЛКУЕШСЯ, ТАК І ПАПРАЦУЕШ

Так любяць паўтараць старыя людзі. І ўспамінаюць, як у часы сваёй маладосці, калі пачынаўся «гарачы» сезон, жонкі штодня насілі полудзень сваім мужам-карміцелям, якія шчыравалі на калгасным полі. Сёння такой неабходнасці няма. Смачныя абеды сваім работнікам гатуюць у сталовых гаспадарак і развозяць па палях на адмысловых машынах. На гэты раз у аб'ектыў фотакарэспандэнта падчас абедзеннага перапынку трапілі механізатары ААТ «Рудакова» Віцебскага раёна Аляксандр ЦІТОЎ і Віктар АМОСЕНКА. У гэтай гаспадарцы ўжо пачалі сеяць раннія збожжавыя культуры. Сёлета патрэбна пасеяць 2,5 тысячы гектараў.



Фота БЕЛТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль СІВАК, міністр транспарту і камунікацый:**

*«Больш за 470 пляцовак будзе прапанавана пад будаўніцтва аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу ў краіне да 2020 года. Мы прынялі «Генеральную схему развіцця прыдарожнага сэрвісу на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах у Беларусі на 2015–2020 гады». Там пазначаны месцы, дзе могуць быць пабудаваны тыя ці іншыя аб'екты. Прапануецца пабудаваць 475 новых аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу. Мы не абмяжоўваем будаўніцтва, але трэба ўлічваць патрэбы рынку. Калі мы будзем імкнуцца да вялікай колькасці дробных пунктаў, то, магчыма, страцім якасць. Мы гэтага не хочам».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.04.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19849,00 | ▲ |
| Еўра | 22536,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 301,52 | ▲ |
| Укр. грыўня | 779,16 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Прамая лінія

## ЗЯМЕЛЬНЫ ПАДАТАК І ПАДАТАК НА НЕРУХОМАСЦЬ АБ'ЯДНАЮЦЬ У АДЗІНЫ ЗБОР?





Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Учора ў рэдакцыі газеты «Звязда» адбылася «прамая лінія» са старшынёй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэем ГАЕВЫМ.**

Кіраўнік камітэта за гадзіну паспеў адказаць нашым чытачам амаль на 15 пытанняў. Галоўным чынам людзей на гэты раз больш цікавілі нюансы зямельнага заканадаўства, будучыя змены пасля заканчэння тэрміну прыватызацыі жыллёвага фонду і іншыя жыццёвыя пытанні, звязаныя з нерухомай маёмасцю.

Асобна Андрэй Гаеў спыніўся на тэме стварэння ў электронным варыянце інфармацыйнай базы па характарыстыках нерухомай маёмасці нашай краіны. Ён адзначыў, што менавіта сёлета ў красавіку адбылося канчатковае ўкараненне сучаснага праграмнага забеспячэння, якое дазваляе па новай электроннай тэхналогіі ўпісваць інфармацыю аб характарыстыках аб'ектаў адразу ў адзіную інфармацыйную базу.

СТАР. 2

■ Мытныя справы

## ПАСЫЛКІ СХУДНЕЮЦЬ

**У Беларусі 14 красавіка зменіцца парадак перамяшчэння тавараў праз мяжу для асабістага карыстання грамадзян, згодна з Указам №40, прынятым Прэзідэнтам краіны 11 лютага сёлета. Дакумент вызначае парадак увозу тавараў у міжнародных паштовых адпраўленнях і так званых «экспрэс-грузах», а таксама тавараў, што перамяшчаюцца наземным транспартам. Асноўная задача ўказа — стварыць бар'ер для ўвозу камерцыйных партый тавараў пад выглядам тавараў для індывідуальных патрэб.**

Норма беспошліннага ўвозу тавараў у міжнародных паштовых адпраўленнях (МПА) і экспрэс-грузах зніжана з 200 еўра і 31 кг да 22 еўра і 10 кг. Па словах **намесніка старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзіміра АРЛОЎСКАГА**, гэта было неабходна з прычыны павелічэння аб'ёмаў увозу тавараў у камерцыйных маштабах без выплаты мытных плацяжоў.

СТАР. 3

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## СМАЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ



**Леанід ДУНЕЦ, урач установы аховы здароўя «Віцебская абласная стаматалагічная паліклініка»:**

— З газеты я даведваюся аб падзеях у краіне ў цэлым. Шырока асвятляюцца ў ёй пытанні грамадска-палітычнага і культурнага жыцця нашага грамадства. Матэрыялы, якія публікуюцца ў «Звяздзе», па-добраму чапляюць маёй эмацыянальнасцю.

На мой погляд, «Звязда» робіцца ўсё цікавейшай. Але я выкажу сваё меркаванне наконт таго, як можна зрабіць газету яшчэ больш прывабнай. Было б выдатна, каб яшчэ часцей друкаваліся артыкулы па гісторыі, пра нацыянальную кухню, тэатральная афіша...

У народзе кажуць: «Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы». «Звязда» — магутная крыніца свежай і карыснай інфармацыі. Дзякуй за тое, што «Звязда» застаецца беларускай газетай з вялікай літары!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*pukshanski@zviazda.by*

# ПРЫЯРЫТЭТЫ Ў ІМЯ МІРУ

**Аляксандр Лукашэнка прыбыў з рабочым візітам у Турцыю, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Як паведамлялася, плануецца, што 14 красавіка ў Стамбуле кіраўнік беларускай дзяржавы прыме ўдзел у саміце Арганізацыі ісламскага супрацоўніцтва, які пройдзе пад дэвізам «Адзінства і салідарнасць у імя справядлівасці і міру». Чакаецца, што ў час мерапрыемства Прэзідэнт Беларусі выступіць з прамовай. Праграмай рабочага візіту таксама прадугледжаны шэраг двухбаковых сустрэч і перагавораў з лідарамі замежных краін.

Арганізацыя ісламскага супрацоўніцтва — міжнародная арганізацыя, у склад якой уваходзіць больш за 50 краін з насельніцтвам 1 млрд чалавек. Беларусь і АІС маюць у многім супадаючыя падыходы і прыярытэты на міжнароднай арэне, у першую чаргу ў такіх сферах, як сямейныя каштоўнасці, рэлігійная талерантнасць, устойлівае развіццё, правы чалавека.

## ■ Парламенцкі дзённік

# БАЛТЫКА БЛІЗКА

**Беларусь можа атрымаць статус назіральніка ў Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора ў жніўні**

**У Мінску адбылася сустрэча дэлегацыі Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора (ПКБМ) з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Віктарам ГУМІНСКІМ. У ходзе сустрэчы абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва ў рамках міжнародных парламенцкіх арганізацый. Акрамя таго, удзельнікі дэлегацыі сустрэліся з прадстаўнікамі міністэрстваў энергетыкі, адукацыі, аховы здароўя, спорту і турызму, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, каб больш дэталёва абмеркаваць магчымасці па нарошчванні ўзаемадзеяння.**

Як адзначыў **старшыня ПКБМ Яніс ВУЦАНС**, які ўзначальваў дэлегацыю, з лістапада мінулага года ПКБМ разглядае пытанне надання Беларусі статусу назіральніка. У сувязі з гэтым у студзені было прынята рашэнне, што неабходна наведаць Мінск, задаць шэраг пытанняў, паслухаць беларускі бок. Вынікі візіту будуць абмяркоўвацца ў маі сёлета. Верагодна, што ў жніўні будзе прынята канчатковае рашэнне аб магчымасці Беларусі атрымаць статус, які дазволіць прысутнічаць на пасяджэннях Генеральнай асамблеі ПКБМ, яе пастаянных камісій. Пры гэтым краіна-назіральніца не зможа ўплываць на прыняцце рашэнняў канферэнцыі, аднак да яе думкі будуць прыслухоўвацца.

Па словах Віктара Гумінскага, узаемадзеянне паміж беларускім парламентам і Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора да цяперашняга візіту цяжка ацаніць адназначна. Але ён выказаў надзею, што гэтая сустрэча дасць магчымасць дасягнуць большага ўзаемапаразумення. Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што Беларусь падала заяўку ад наданні ёй статусу назіральніка ў ПКБМ яшчэ ў 2010 годзе. У 2015 годзе краіна двойчы пацвердзіла свой намер супрацоўнічаць па самых розных напрамках, тым самым падкрэсліваючы, што заяўка застаецца ў сіле. Для нашай краіны падобнае супрацоўніцтва мае пэўную цікавасць, улічваючы, што наш парламент супрацоўнічае са многімі рэгіянальнымі арганізацыямі, з'яўляецца там назіральнікам ці нават актыўным членам. Супрацоўніцтва з такой паважанай арганізацыяй, як Парламенцкая канферэнцыя Балтыйскага мора, адкрые новыя магчымасці, аднак, як лічыць віцэ-спікер ніжняй палаты Беларускага парламента Віктар Гумінскі, у выпадку, калі гэтага не атрымаецца, Беларусь працягне працаваць на двухбаковым узроўні, як гэта адбываецца сёння.

**Дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Беларусі Вадзім КАРМАЗІН** паведаміў, што з 2011 года рэалізуецца шэраг праектаў у рамках рэгіёна Балтыйскага мора. На гэтыя рэгіёны прыпадае больш за 20% турыстаў, якія накіроўваюцца з іншых краін, каб наведаць Еўропу. Дзякуючы гэтаму Беларусь штогод наведваюць каля двух мільёнаў вандроўнікаў. Сюды адносяцца і дзелавыя візіты, якія прыносяць вялікі даход. Менавіта таму нашай краіне выгадна, каб гэты рэгіён развіваўся як адзіны турыстычны кластар.

Вялікая цікавасць у двух бакоў ёсць і ў супрацоўніцтве па пытаннях экалогіі. Як адзначыў **начальнік упраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Міністэрства прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя Сяргей ЗАЎЯЛАЎ**, Беларусь выклікае інтарэс у краін рэгіёна Балтыйскага мора як блізкі партнёр па ахове навакольнага асяроддзя.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

## ■ Інтэграцыя

# БЕЗ ВЫКЛЮЧЭННЯЎ І АБМЕЖАВАННЯЎ

**У Маскве прайшоў саміт кіраўнікоў урадаў краін ЕАЭС**

**Беларусь прытрымліваецца погляду, што галоўная мэта ў развіцці еўразійскай інтэграцыі — ліквідацыя выключэнняў і абмежаванняў ва ўзаемным гандлі. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ падчас свайго выступлення на Еўразійскім міжурадавым савеце.**

### ПАДТРЫМКА ПАРТНЁРАЎ

«Прапаную вярнуцца да нашай ідэі сабраць прапановы бакоў па першачарговым спісе 10-20 выключэнняў і прыняць меры па іх аператыўнай ліквідацыі», — сказаў Андрэй Кабякоў.

Кіраўнік беларускага ўрада таксама адзначыў, што Беларусь чакае ўмацавання каардынуючай ролі Еўразійскай эканамічнай камісіі пры вырашэнні «унутраных супярэчнасцяў паміж дзяржавамі ЕАЭС». Гэта тычыцца ў тым ліку пытанняў забеспячэння свабоднага гандлю і допуску да дзяржаўных закупак, тарыфнай і нетарыфнай абароны ўнутранага рынку ЕАЭС. Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што асаблівую актуальнасць пералічанае набывае ва ўмовах далучэння да ЕАЭС новых дзяржаў-членаў і ўступлення Казахстана ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Ён нагадаў, што на мінулым тыдні Прэзідэнтам Беларусі было прынята рашэнне аб актывізацыі перамоў з Сусветнай гандлёвай арганізацыяй.

«У найбліжэйшы час урад правядзе серыю сустрэч з членамі арганізацыі, а таксама падрыхтуе абноўленыя перагаворныя прапановы, — паведаміў Андрэй Кабякоў. — Сёння нам неабходна ваша садзейнічанне. Разлічваем на падтрымку партнёраў па ЕАЭС — членаў СГА як у працоўнай групе па далучэнні Беларусі да арганізацыі, так і ў інтэграцыйным фармаце. Са свайго боку, мы цалкам адкрытыя і гатовы абмяркоўваць параметры нашага далучэння — у тым ліку і самыя спецыфічныя нюансы».

### САЮЗ АДБЫЎСЯ, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НІ НА ШТО

У сваю чаргу **прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый МЯДЗВЕДЗЕЎ** адзначыў, што з часу апошняй сустрэчы кіраўнікоў урадаўназбіралася пытанні для абмеркавання.

«Самае важнае, што хацеў бы яшчэ раз канстатаваць: наш саюз адбыўся як сучаснае і эфектыўнае інтэграцыйнае аб'яднанне, — заявіў кіраўнік расійскага ўрада, — якое працуе на прасторы дзяржаў-членаў і прыносіць рэальныя вынікі: як у перыяд, калі эканомікі растуць, так і ў перыяд, калі яны знаходзяцца ў няпростым стане».

Дзмітрый Мядзведзеў падкрэсліў, што на працу ЕАЭС у цэлым, на стан эканомік краін-удзельніц у прыватнасці аказваюць уплыў знешнія фактары, у тым ліку такія, як нестабільнасць глабальных фінансавых і таварных рынкаў. «Аднак статыстыка сведчыць: функцыянаванне саюза адыгрывае стабілізуючую ролю для эканомік дзяржаў «пяцёркі», — звярнуў увагу расійскі прэм'ер. — Агульны рынак са 180 мільёнамі спажыўцоў па азначэнні з'яўляецца больш устойлівым, валодае большымі рэзервамі, чым эканомікі, узятыя паасобку».

### ЕС ЦІ КІТАЙ?

«Кіраўнікамі ўрадаў былі абмеркаваны прыярытэтныя пытанні інтэграцыі, — паведаміў па выніках саміту **старшыня Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Тыгран САРКІСЯН.** — Перш за ўсё, для Еўразійскай эканамічнай камісіі былі вызначаны дакладныя рамкі — як мы будзем працаваць з Еўрапейскім саюзам, як будзем будаваць наш дыялог з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Кіраўнікі ўрадаў агучылі тыя асноўныя пытанні, якія павінны быць у цэнтры ўвагі пры абмеркаванні стратэгіі супрацоўніцтва ў гэтых двух напрамках».

Яшчэ адно пытанне, якое ўчора прэм'еры абмяркоўвалі ў Маскве, тычыцца прамысловай палітыкі Еўразійскага эканамічнага саюза.

«Гэта тэхналагічная платформа, інфармацыйны блок, — паведаміў журналістам Тыгран Саркісян, — адпаведныя рашэнні былі сёння прыняты кіраўнікамі ўрадаў. Безумоўна, быў і цэлы блок тэхнічных пытанняў, звязаных з дзейнасцю Еўразійскай эканамічнай камісіі — гэта наша справаздача, бюджэт».

Па словах старшыні Калегіі ЕЭК, цяпер у цэнтры ўвагі Еўразійскай эканамічнай камісіі два дакументы. «Першы мы прынялі летась — гэта праграма дзеянняў па рэалізацыі тых асноўных кірункаў, якія былі вызначаны беларускім бокам па прыярытэтных задачах, — расказаў Тыгран Саркісян. — Сёлета мы будзем працаваць на падставе тых дырэктыў і ўказанняў, якія мы атрымалі ад старшынствуючага боку. Гэта інтэнсіфікацыя працы з трэцімі краінамі, што з'яўляецца прыярытэтам на гэты год».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*
*г. Масква.*

■

## ■ Таленты

# ІДЭІ МАЛАДЫХ ЯК ІНВЕСТЫЦЫЙНЫ РЭСУРС

**38 праектаў з шасці краін будуць прадстаўлены на конкурсе «100 ідэй для СНД».**

Пра гэта журналістам паведаміў **першы сакратар ЦК Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Андрэй БЕЛЯКОЎ.** Удзел у выставе-прэзентацыі возьмуць маладыя вынаходнікі з Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана і Расіі.

— Я хачу падзякаваць тым, хто падтрымаў ідэю такога конкурсу ў 2013 годзе, — сказаў Андрэй Белякоў. — Падчас фіналу мы вызначым найлепшых у васьмі намінацыях. Гэта вельмі важна, бо мы атрымаем пацвярджэнне таго, што любая ідэя можа не толькі прайсці стадыі ініцыявання і падтрымкі, але і даць рэальны вынік. Літаральна днямі падчас чарговага інтэрнэт-форуму БРСМ мы прэзентавалі платформу «100 ідэй для СНД». Фактычна ў нас з'явіўся банк звестак таленавітай моладзі. Мы збіраемся і надалей развіваць гэты кірунак, акумуляваць праекты і, хто ведае, магчыма, праз некалькі гадоў ён стане сур'ёзным інвестыцыйным рэсурсам.

На думку Андрэя Белякова, паміж удзельнікамі будзе сапраўдная барацьба за перамогу, але, на яго думку, такая канкурэнцыя пойдзе ім толькі на карысць. «У любым выпадку, наша галоўная мэта — рэалізацыя кожнага праекта», — зазначыў першы сакратар саюза моладзі.

Акрамя выставы, у Нацыянальнай бібліятэцы пройдзе юбілейнае дзясятае пасяджэнне Савета па справах моладзі СНД. Яго ўдзельнікі абмяркуюць вынікі працы ў 2014 і 2015 гадах, а таксама сплануюць сваю працу на наступныя два гады.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

# АДЗІНЫ ЗБОР...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Раней такая інфармацыя аб аб'ектах нерухомасці спачатку акумулявалася ў рэгіянальных структурах камітэта (той ці іншай вобласці). Адзіная база дазваляе фарміраваць па адзіных патрабаваннях і архіў матэрыялаў, звязаных з тэхнічнай інвентарызацыяй. Больш за тое, архіў стане цалкам мабільным, таму карыстацца ім будзе больш проста і хутка — без выкарыстання папяровых носьбітаў.

***С.К. — Літаральна ў красавіку паміж Мінскам і штаб-кватэрай Сусветнага банка быў праведзены відэамост у Вашынгтоне. Ён быў арганізаваны з удзелам Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі. Пра што там ішла размова і пра якія папярэднія вынікі сёння можна гаварыць?***

— Там да ўвагі міжнароднай фінансавай арганізацыі была прадстаўлена спецыяльная прэзентацыя ідэй і планаў па развіцці ў нашай краіне масавай ацэнкі нерухомасці і рэфармаванні падатковай сістэмы.

Ініцыятарам правядзення такой ацэнкі выступае Нацыянальнае кадастравае агенцтва Дзяржаўнага камітэта па маёмасці. Да ўдзелу ў відэаканферэнцыі ад беларускага боку былі запрошаны прадстаўнікі Дзяржкаммаёмасці, Міністэрства па падатках і зборах і Міністэрства фінансаў. Разглядзець усе нюансы тэхналогіі масавай ацэнкі і фарміравання нерухомасці на падставе кадастравай ацэнкі, а таксама зарыентавацца па ўзроўні выдаткаў на правядзенне такой работы ў цэлым для Беларусі дазволіць пілотны праект, які стартаваў у студзені 2015 года і ажыццяўляецца на тэрыторыі Савецкага раёна Мінска і Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

Гэтым праектам было ахоплена каля 150 тысяч аб'ектаў нерухомасці. Акрамя адпрацоўкі тэхналогіі масавай ацэнкі і масавага фарміравання нерухомасці, ён павінен дапамагчы вызначыць магчымасць змены сістэмы падаткаабкладання нерухомасці. Прапануецца выкарыстоўваць адзіны падатак на нерухомую маёмасць. Канчатковыя вынікі пілотнага праекта Нацыянальнае кадастравае агенцтва плануе падвесці сёлета ў маі-чэрвені.

***— Гэта будзе яшчэ адзін новы збор?***

— Не. Пасля канчатковай рэалізацыі гэтага пілотнага праекта ў краіне будзе разглядацца рашэнне аб мэтазгоднасці ўвядзення адзінага падатку на нерухомую маёмасць. Нагадаю, што цяпер падаткаабкладанне зямельных участкаў і маёмасці на гэтай зямлі ажыццяўляецца асобна.

***— Маецца на ўвазе зямельны падатак і падатак на нерухомасць?***

— Так. Гэтыя два зборы плануецца аб'яднаць і выкарыстоўваць адзіны падатак на нерухомасць. Падобнае наваўвядзенне таксама будзе садзейнічаць прыняццю і іншых рашэнняў у сферы кіравання нерухомасцю. У многіх дзяржавах такое адзінае падаткаабкладанне нерухомай маёмасці выкарыстоўваецца працяглы час і даволі паспяхова.

Эксперты міжнароднай фінансавай арганізацыі ўхвалілі нашы падыходы ў галіне збору звестак пра аб'екты нерухомасці, сістэмы рэгістрацыі нерухомасці і кадастравай ацэнкі, а таксама адзначылі той факт, што падыход да кадастравай ацэнкі і падаткаабкладання адзінага аб'екта (зямельны ўчастак і пабудова на ім) адпавядаюць найлепшым сусветным тэндэнцыям.

Вынікі кадастравай (масавай) ацэнкі могуць выкарыстоўвацца не толькі для мэт падаткаабкладання, а яшчэ для шэрагу іншых дзяржаўных мэт, якія павышаюць празрыстасць рынку нерухомасці і эфектыўнасць рашэнняў, што прымаюцца. Паводле слоў замежных спецыялістаў, «у Беларусі ўдалося стварыць эфектыўную сістэму рэгістрацыі правоў на аб'екты нерухомасці, якая ўваходзіць у дзясятку найлепшых паводле рэйтынгу Сусветнага банка «Doing Business». Сёння ў краіне дзяржаўную рэгістрацыю маюць каля 85% усіх аб'ектаў нерухомасці. Гэта азначае, што правы іх уладальнікаў пацверджаны і аспрэчвацца нікім не будуць.

***— Калі рашэнне аб увядзенні адзінага падатку на нерухомасць будзе прынята, то як хутка яно пачне дзейнічаць?***

— Пра канкрэтныя тэрміны казаць пакуль зарана, бо спачатку аналіз па гэтым пытанні павінны правесці спецыялісты падатковай галіны, Мінфіна і іншыя зацікаўленыя дзяржорганы. Толькі пасля гэтага будуць вызначаны канчатковыя перыяды і часавыя цыклы правядзення змен у падатковай сферы.

А пакуль Сусветны банк выказаў гатоўнасць накіраваць напрыканцы мая ў Беларусь сваю місію, у склад якой увойдуць спецыялісты банка і іншыя міжнародныя эксперты. З іх удзелам плануецца арганізаваць спецыяльны семінар, на якім будзе прадстаўлены міжнародны вопыт па гэтым напрамку. Беларускі бок агучыць канчатковыя вынікі пілотнага праекта. Удзельнікі сустрэчы абмяркуюць магчымыя планы змен і далейшага развіцця ў Беларусі сістэмы кадастравай ацэнкі, фарміравання нерухомасці і збору звестак пра яе, а таксама магчымыя змены ў сістэме падаткаабкладання нерухомасці.

***Цалкам тэкст «прамой лініі» з Андрэем Гаевым чытайце ў наступных нумарах «Звязды».***

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## ЗВАНІЦЕ — ВАС ПАЧУЮЦЬ

У краіне працягваецца штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній. Такі дыялог створаны ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей. «Прамыя лініі» праходзяць ужо больш за год, яны стартавалі ў студзені 2015-га і праводзяцца па суботах.

**16 красавіка з 9.00 да 12.00. на пытанні адкажуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам** — намеснік старшыні ЦУПРЫК Леанід Аляксандравіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам** — намеснік старшыні АСКЕРКА Віктар Віталевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам** — намеснік старшыні ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам** — першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алейзавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам** — намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васілевіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам** — намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам** — намеснік старшыні КАРПЕНКА Ігар Васілевіч (80172224444).

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **Лот №1.** Колонки акустические Dynacord MT 215 (2 шт.) Первоначальная стоимость – 410 000 рублей. **Лот №2.** Усилитель Dynacord S 1200 (2 шт.) Первоначальная стоимость – 15 026 000 рублей. **Лот №3.** Усилитель Luxomat SW-02 (1 шт.) Первоначальная стоимость – 1 820 000 рублей. **Лот №4.** Усилитель Palladium 2000 (1 шт.) Первоначальная стоимость – 8 046 000 рублей. **Лот №5.** Колонки акустические Linear LP 112 (3 шт.) Первоначальная стоимость – 3 585 000 рублей. **Лот №6.** Световые лазерные установки Teclumen (2 шт.) Первоначальная стоимость – 9 116 000 рублей. **Лот №7.** Лампы неонового цвета (10 шт.) Первоначальная стоимость – 6 370 000 рублей. **Лот №8.** Шар электрический световой (1 шт.) Первоначальная стоимость – 1 245 000 рублей. **Лот №9.** Стулья барные (12 шт.) Первоначальная стоимость – 3 528 000 рублей. **Лот №10.** Мойки керамические (8 шт.) Первоначальная стоимость – 1 656 000 рублей. **Лот №11.** Водонагреватель электрический (1шт.) Первоначальная стоимость – 890 000 рублей. **Лот №12.** Фонари уличные (9 шт.) Первоначальная стоимость – 4 113 000 рублей. **Лот №13.** Кондиционер McQuay MLC025CR Acpoa (1 шт.) Первоначальная стоимость – 11 873 000 рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОДО «БелЮрцМагистраль», УНП 391120443 |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Оршанский район, д. Юрцево, ул. Магистральная, 1 |
| **Информация об обременениях** | Без обременений |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 9 **13 мая 2016 года в 11.00** |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши 211030, г. Орша, ул. Островского, 36 Главный специалист – Маханькова Анастасия Александровна, тел. 80216543205. |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 30002505, **не позднее 11.00 13.05.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |


# МЫ — МОЖАМ!

## У кросе ў гонар славутага касманаўта-земляка ўдзельнічалі жыхары Чэрвеньшчыны

**Апошнім часам у Чэрвені, што на Міншчыне, ладзяць усё больш мерапрыемстваў, прысвечаных знакамітаму земляку, ураджэнцу гэтых мясцін, касманаўту Алегу Навіцкаму. І сімвалічна, што адбываецца гэта ў год яго маркуемага другога палёту да зор.**

...Не паспелі яшчэ забыцца падрабязнасці першага касмічнага фестывалю, як новае мерапрыемства прапанаваў усім зацікаўленым аддзел адукацыі, спорту і турызму Чэрвеньскага райвыканкама. Сумесна з Беларускай федэрацыяй лёгкай атлетыкі дзяцей і дарослых запрасілі на лёгкаатлетычны крос імя Алега Навіцкага. І натуральна, што адбылося спартыўнае выпрабаванне не ў звычайны дзень тыдня, а ў святочны: у Сусветны дзень авіяцыі і касманаўтыкі, 12 красавіка.

Своеасаблівым паўнамоцным прадстаўніком знакамітага земляка стала яго маці, Валянціна Эдуардаўна Навіцкая.

365 удзельнікаў — неблагая для першага разу колькасць! — дзеляцца на дзве групы: юнакі і дзяўчаты. Яны будуць стартаваць асобна. Большасць — школьнікі. Перад імі — асфальтаваныя вуліцы горада, дыстанцыя ў паўтара кіламетра і такі жаданы, але пакуль яшчэ далёкі фініш — каля новага будынка фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Ігумен», адкрытага мінулай восенню.

Гэта толькі здаецца, што паўтара кіламетра — дыстанцыя невялікая... Але нават калі п'едэстал гонару скарыўся не ўсім, нагоды для засмучэння няма. Галоўнае — кожны дабег і даказаў найперш сабе: "Я — магу!" Да таго ж, абсалютна ўсе спартсмены атрымалі на памяць сертыфікат удзельніка кросу імя Алега Навіцкага ад Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі.

Былі, безумоўна, і ўрачыстыя фанфары ў гонар пераможцаў і прызёраў, граматы і медалі, якія ўручыла мама касманаўта.

**Ксенія УЛАДЗІМІРАВА.**

■ Будзь у курсе!

# ДЗІЦЯЧАЯ ЧЫГУНКА ЗАПРАШАЕ

**30 красавіка Дзіцячая чыгунка імя Канстанціна Заслонава Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі адкрые свой чарговы, 61-й сезон.**



Цягнік «Сталічны экспрэс» будзе курсіраваць у маі па суботах і нядзелях, а таксама ў святочныя дні з 11.00 да 16.40. Летам ён будзе перавозіць сваіх пасажыраў па серадах, чацвяргах і пятніцах з 11.00 да 14.00, па суботах і нядзелях — з 11.00 да 16.40. У верасні праехацца ў «Сталічным экспрэсе» можна будзе па суботах і нядзелях з 11.00 да 16.40, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі. Цягам летняга перыяду па выхадных і святах пасажыраў цягніка на станцыі Заслонава будуць сустракаць казачныя персанажы, дзятву чакаюць розныя гульні, конкурсы і віктарыны. Апроч таго, кожную нядзелю пасажыры змогуць убачыць канцэрт калектываў аматарскай мастацкай творчасці культурна-спартыўнага цэнтра Мінскага аддзялення магістралі. Да Дня Перамогі і Дня Незалежнасці будзе падрыхтавана асобная святочная праграма.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Падзея

# ПАСЛЯДОЎНІКІ АЛОЎНІКАВА

**У Бабруйску падвялі вынікі першага адкрытага рэгіянальнага конкурсу юных піяністаў у гонар славутага земляка.**

— Глыбока сімвалічна, што Год культуры прыняў эстафету Года моладзі, а журы конкурсу ўзначаліў сын нашага земляка, народны артыст Рэспублікі Беларусь, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Ігар Уладзіміравіч Алоўнікаў. Упэўнены, што ідэі, пакладзеныя ў аснову конкурсу, гарантуюць яму прапіску ў Бабруйску на доўгія гады. А мы станем сведкамі адкрыцця новых імёнаў, якія стануць гонарам нашай краіны і праславяць яе далёка за межамі, — адзначыў **Андрэй КАВАЛЕНКА, старшыня Бабруйскага гарадскога выканаўчага камітэта і адначасова старшыня аргкамітэта конкурсу**.

140 навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў з 16 гарадоў Магілёўшчыны два дні спаборнічалі за званне лепшага піяніста. У іх выкананні гучалі класічныя творы народнага артыста і заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Уладзіміра Алоўнікава і іншых кампазітараў.

Абсалютнай пераможцай, якая атрымала Гран-пры конкурсу, стала Дар'я Рыдлевіч, вучаніца дзіцячай школы мастацтваў № 3 імя М.Н. Салдатава з Магілёва (настаўнік М. Малахава). Дыпломамі і грашовымі прэміямі таксама адзначаны лаўрэаты 1-й ступені ў 4 узроставых групах — Вера Касцюкевіч і Савелій Андрэеў з Магілёва, Аляксандра Арлоўская з Віцебска, Анастасія Тароп з Гомеля, Ангеліна Цабкала з Мінска, Аліна Салтыкова з Бабруйска, Соф'я Хацяновіч з Салігорска. Педагогі юных талентаў атрымалі граматы аргкамітэта і журы конкурсу за высокае падрыхтоўку маладых майстэрства. А калектыву Бабруйскай дзіцячай школы мастацтваў № 2 імя У.У. Алоўнікава намеснік старшыні Бабруйскага гарвыканкама Аляксандр Маркачоў уручыў спецыяльны прыз — ноўтбук.

— Я ўдзячны гэтаму гораду, яго кіраўніцтву, школе за падтрымку нашай сям'і. Прыемна здзіўлены высокім узроўнем арганізацыі гэтага мерапрыемства.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■


## ОАО «Озтранс»

223021, Минский р-н, Щомыслицкий с/с,
п/о Озерцо, Менковский тракт, 21. Тел./факс 507-61-31

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ОАО «ОЗТРАНС»**
**на 1 января 2016 года**

млн руб.

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. Долгосрочные активы** | **52493** | **III. Собственный капитал** | **26846** |
| Основные средства | 51814 | Уставный капитал | 26540 |
| Нематериальные активы | 0 | Добавочный фонд | 30 |
| Вложения в долгосрочные активы | 656 | Нераспределенная прибыль | 61 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 1 | Чистая прибыль(убыток) отчетного года | 215 |
| Прочие долгосрочные активы | 22 | **IV. Долгосрочные обязательства** | **21008** |
| **II. Краткосрочные активы** | **9891** | Долгосрочные кредиты и займы | 20340 |
| Запасы | 55 | Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 668 |
| Расходы будущих периодов | 38 | | |
| Налог по приобретенным ценностям | 4458 | **V. Краткосрочные обязательства** | **14530** |
| Дебиторская задолженность | 5316 | Краткосрочные кредиты и займы | 12393 |
| Денежные средства | 17 | | |
| Прочие краткосрочные активы | 7 | Кредиторская задолженность | 2137 |
| **Баланс** | **62384** | **Баланс** | **62384** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**

млн руб.

| | |
|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 7404 |
| Себестоимость реализации товаров, продукции, работ, услуг, управленческие расходы | 7055 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ | 2707 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 1982 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 2045 |
| Прибыль (убыток) по текущей деятельности | 286 |
| Доходы по инвестиционной, финансовой деятельности | 199 |
| Расходы по инвестиционной, финансовой деятельности | 217 |
| Прибыль (убыток) по инвестиционной деятельности | -18 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 268 |
| Налог на прибыль | 53 |
| Чистая прибыль | 215 |

**Информация об ОАО и его деятельности**

Доля государства в уставном фонде эмитента – -
Количество акционеров – 38, в т.ч.: юридических лиц – 1, физических лиц – 37.
**Информация о дивидендах и акциях**

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ | Ед. изм. | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 0,27 | 0,00 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | млн руб. | 0,00 | 0,00 |
| Дивиденды приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,26 | 0,00 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,00 | 0,00 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. руб. | 25,24 | 25,16 |

**ОТДЕЛЬНЫЕ ФИНАНСОВЫЕ РЕЗУЛЬТАТЫ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**

млн руб.

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, работ, услуг | 7404 | 4252 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, управленческие расходы, расходы на реализацию | 7055 | 4691 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 268 | 8 |
| в т.ч: прибыль(убыток) от реализации товаров, работ, услуг, продукции | 349 | -439 |
| в т.ч: прочие доходы и расходы по текущей деятельности | -63 | 14 |
| в т.ч: прибыль(убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | -18 | 433 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов, налоговых обязательств, прочие налоги исчисляемые из прибыли | 53 | 11 |
| Чистая прибыль (убыток) | 215 | -3 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 61 | 64 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | 21008 | 839 |
| Среднесписочная численность работающих (чел.) | 25 | 24 |
| 9. Основные виды деятельности, по которым получено более двадцати процентов выручки от реализации: деятельность грузового автомобильного транспорта 42%, сдача в наем собственного недвижимого имущества 21% | | |

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался бухгалтерский баланс з за 2015 год: 30 марта 2016 года.
Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: общество работает по утвержденному Уставу ОАО «Озтранс», Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг ОАО «Озтранс» утвержден на общем собрании от 30.03.2010 №13

**Директор ОАО «Озтранс» С.А. Сахарук**
**Главный бухгалтер Е.М. Балашевич**

**Данные отчетности подтверждены:** ИП Акулич Валентина Болеславовна, квалификационный аттестат аудитора №0000159 от 12.11.2002 года выдан Министерством финансов РБ, регистрационный № 158.


# ПАСЫЛКІ СХУДНЕЮЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Паводле статыстыкі мытных органаў, за перыяд 2013-2015 гг. аб'ём увезеных МПА павялічыўся больш як у 6 разоў: калі ў 2013-м гэты лік складаў 1,9 млн, то ўжо ў 2015 г. было ўвезена 11,8 млн пасылак. Пры гэтым пасылкі з-за мяжы прыходзілі ў асноўным з інтэрнэт-крам і толькі для 10% жыхароў краіны.

З 14 красавіка ў выпадку атрымання тавараў, даражэйшых за 22 еўра і (або) цяжэйшых за 10 кг, за кожны «лішні» кілаграм будуць налічаны мытныя пошліны, падаткі па ранейшай стаўцы — 30% ад цаны, але не менш як 4 еўра за 1 кг.

Мытныя плацяжы ажыццяўляюцца атрымальнікам у паштовым аддзяленні, у якім выдаецца пасылка. Інфармаваць адрасата аб неабходнасці выплаты мытных плацяжоў будзе аператар паштовай сувязі. Пры гэтым норма бяспошліннага ўвозу не сумуецца для членаў сям'і, г.зн. кожны можа атрымліваць пасылкі ў межах вызначаных нормаў. Акрамя таго, па-ранейшаму захоўваецца магчымасць бяспошліннага атрымання грашовых сродкаў у лістах у межах сумы, у эквіваленце не большай за 200 долараў ЗША.

Згодна з дакументам, ліміты не распаўсюджваюцца на паштовыя адпраўленні з дзяржаў — членаў ЕАЭС (Расійская Федэрацыя, Рэспубліка Казахстан, Рэспубліка Арменія, Кыргызская Рэспубліка).

Таксама з 14 красавіка тавары ў выпадку ўвозу часцей за адзін раз на тры каляндарныя месяцы на суму звыш 300 еўра і (або) вагой, большай за 20 кг, не будуць залічвацца да тавараў для асабістага карыстання. Пры гэтым нормы бяспошліннага ўвозу тавараў у 1500 еўра і 50 кг працягваюць дзейнічаць. Акрамя таго, з уступленнем у сілу Указа №40 будзе ажыццяўляцца ўлік частаты перамяшчэння тавараў праз мяжу. Набытыя фізічнай асобай у крамах бяспошліннага гандлю тавары будуць таксама ўключацца пры разліку лімітаў увозу тавараў для асабістага карыстання праз аўтамабільныя і чыгуначныя пункты пропуску.




Ва ўказе ёсць і шэраг выключэнняў. Так, тавары, якія ўвозяцца паветраным транспартам, вывезеныя раней і ўвозяцца фізічнымі асобамі назад (пры наяўнасці дакументаў, што пацвярджаюць іх вываз); якія ўвозяцца супрацоўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў, консульскіх установаў і іншых міжнародных арганізацый; атрымання ў спадчыну, а таксама тыя, што ўвозяцца пры перасяленні на пастаяннае месца жыхарства ў Беларусі, — пошлінамі не абкладаюцца.

Акрамя таго, нормы ўказа не распаўсюджваюцца на тавары, якія былі ва ўжыванні і пры гэтым вывозяцца за межы мытнай тэрыторыі, а пасля ўвозяцца назад у нязменным стане без дакументальнага пацвярджэння іх вывазу (напрыклад, мабільныя тэлефоны, фотаапараты, планшэты, ноўтбукі і інш.), калі іх кошт і вага не перавышае 1500 еўра і 50 кг. Калі ж кошт або вага (важныя абодва паказчыкі) гаджэтаў вышэйшыя за гэтую норму, то пры выездзе з краіны неабходна іх задэклараваць. Дакументы, якія пацвярджаюць вываз тавараў з мытнай тэрыторыі ЕАЭС, уключаюць пасажырскую мытную дэкларацыю, дагавор куплі-продажу, таварны чэк.

У выпадку, калі грамадзянам спатрэбіцца адказы на праблемныя пытанні па новых правілах увозу тавараў, можна звярнуцца ў кол-цэнтры мытнаў і Дзяржаўнага мытнага камітэта, якія запрацуюць у найбліжэйшы час. Нумары тэлефонаў можна знайсці на афіцыйным сайце ведамства.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■ Твае правы

# ДОЎГ РАСЦЕ ЯК НА ДРАЖДЖАХ

## Як зрабіць вяртанне грошай зручным для ўсіх?

**Скарачаць тэрміны спагнання даўгоў, узмацняць адказнасць за правапарушэнні, папярэджваць наўмыснае банкруцтва прадпрыемстваў і рэалізоўваць маёмасць праз электронныя таргі... Сёлета ў службе прымусовага выканання Беларусі павінны запрацаваць некаторыя новыя механізмы, якія дапамогуць разабрацца з асобнымі акалічнасцямі і недарэчнасцямі працы судовых выканаўцаў.**



### ЭЛЕКТРОННЫЯ ТАРГІ

— Нагрузка на прымусовых выканаўцаў з года ў год павялічваецца. Цяпер гэта ўжо больш за 200 спраў на аднаго чалавека штомесяц. Своечасова адпрацаваць усе гэтыя дакументы проста фізічна немагчыма, — запэўніў **Андрэй АЎДЗЕЕЎ, галоўны судовы выканаўца Рэспублікі Беларусь**. — Некаторыя даўгі пры гэтым настолькі... невялікія, што на іх спагнанне затрачваецца больш сродкаў, чым сама запазычаная сума.

Так, каля 1 000 000 выканаўчых спраў штогод — гэта дакументы, сума спагнання ў якіх не перавышае 10 базавых велічынь (БВ). Працэдуру іх вяртання можна было б значна спрасціць.

— Існуе механізм прымусовага спагнання сродкаў па юрыдычных спрэчках, калі патрабавальнік грошай прад'яўляе выканаўчы дакумент у банк даўжніка. Калі ў апошняга ёсць на рахунку грошы, пытанне вырашаецца без умяшання судовага выканаўцы. 10-15% спраў здзяйсняюцца менавіта так, — распавёў Андрэй Аўдзееў. — Мы прапануем рэалізаваць такую ж магчымасць у дачыненні да фізічных асоб, калі сума доўгу не перавышае 10 базавых велічынь. Патрабавальнік сам накіроўваў бы выканаўчы ліст з рашэннем суда па вядомым месцы працы даўжніка. Каля 30% грамадзян, якія ўхіляюцца ад выплаты сваіх даўгоў, працаўладкаваны. Улічваючы сярэднія памеры заробкаў у краіне і магчымасць спагнаць з зарплаты да 50% на пагашэнне доўгу, думаю, за месяц да 90% такіх спраў былі б выкананы.

**Людзі бяруць вялікія крэдыты, афармляюць маёмасць на іншых, жывуць цудоўна, усім гэтым карыстаючыся, а ўзяць з іх няма чаго. І крыніцы заробкаў не выявіць.**

Некаторыя банкі-патрабавальнікі самі просяць выканаўцаў накіраваць дакументы па месцы працы даўжніка, нават калі спаганяюць сумы і большыя за 10 БВ, бо ведаюць, што гэта значна зменшыць тэрмін вяртання грошай.

Мяркуецца, што ў красавіку запрацуе схема продажу ліквіднай маёмасці даўжніка на электронных пляцоўках — гэта дазволіць атрымаць большую суму ў залік спагнання. Калі таргі не адбудуцца адзін ці некалькі разоў, то дапускаць значнае зніжэнне цаны, як гэта бывае на звычайных аўкцыёнах, выканаўцы не будуць.

— Паніжаць кошт маёмасці больш чым на 20% ад стартавай сумы мы не будзем, — запэўніў галоўны судовы выканаўца краіны. — Праектам закона «Аб выканаўчай працэдуры» прадугледжана, што першасная ацэнка і так адразу заніжаецца на 30% ад рыначнай. Між тым, пераацэнка пасля няўдалых першых таргоў застанецца адзінай. Калі і на першым ці другім аўкцыёне маёмасць даўжніка не купяць, то яе прапануюць патрабавальніку ў якасці аплаты доўгу.

### БАНК ДАНЫХ НЕПЛАЦЕЛЬШЧЫКАЎ

З 1 красавіка ва ўсе тэрытарыяльныя органы службы прымусовага выканання пачала ўкараняцца праграма «АІС ПВ» — аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма прымусовага выканання. Да канца 2016-га яна будзе працаваць у тэставым рэжыме. Пакуль яе задачы гэта ўтрыманне шаблонаў працэсуальных дакументаў (розныя запыты, арышты рахункаў і іншыя), фарміраванне рэестра даўжнікоў і справаздач. У далейшым запланавана яе ўзаемадзеянне з іншымі інфармацыйнымі рэсурсамі: банкамі, рэгістрамі нерухомай маёмасці, рэгістрамі насельніцтва і іншымі.

— Мы зможам атрымліваць звесткі пра маёмасную і грашовую сітуацыю даўжніка, яго кантакты, дасылаць справаздачы па выкананых мерапрыемствах у падатковыя органы і Вярхоўны суд, — зазначыў Андрэй Аўдзееў. — З Нацыянальным банкам, напрыклад, у рамках АІС ПВ да канца года запланаваны пераход на поўнасцю электронны дакументаабарот па справах юрыдычных асоб. Дакументы ў нашых шаблонах будуць пераводзіцца праграмай у шаблон банкаў, а зваротныя ад іх — канверсавацца ў нашу сістэму.

Першая інфармацыя, якая стане агульнадаступнай на інтэрнэт-партале Мінюста, — звесткі пра ўсіх даўжнікоў. Пакуль распаўсюджваецца толькі абмежаваная частка інфармацыі пра самых злосных парушальнікаў, справы якіх больш за тры месяцы знаходзяцца на выкананні або завершаны з-за ліквідацыі ці банкруцтва прадпрыемстваў.

### АДКАЗНАСЦЬ СУБСІДЫЯРНАЯ І КРЫМІНАЛЬНАЯ

Змагацца з юрыдычнымі асобамі, якія праз даўгі могуць аб'явіць сябе банкрутамі, тым самым пазбавіўшыся адказнасці, вельмі цяжка, зазначыў судовы выканаўца. Асабліва, калі банкруцтва мэтанакіраванае. Фірма-даўжнік зачыняецца, а на яе месцы ствараецца іншае прадпрыемства, якое адрозніваецца ад папярэдняга ледзьве не адной літарай. Працаўнікі там усё тыя ж, а даўгі ўжо спісаны праз банкруцтва.

— Каб не дапусціць пагалоўнага выйсця з сітуацыі з даўгамі такім чынам, існуе паняцце прыцягнення да субсідыярнай адказнасці. Калі будзе даказана, што прадпрыемства пацярпела праз дзеянні першых асоб фірмы, яе даўгі будуць перакладзены на кіраўнікоў як фізічных асоб. Праўда, недакладнасці нашай сістэмы дазваляюць ім выйсці сухімі з вады, бо іх маёмасць перапісана на іншых асоб. Больш жорсткая адказнасць на такіх асоб таксама не надта паўплывае. Лепш па законе абмежаваць такім суб'ектам умовы вядзення бізнесу, каб пэўны час пасля банкруцтва прадпрыемства, яго былыя кіраўнікі не маглі займаць першыя пасады.

А вось у дачыненні да фізічных асоб, якія не выконваюць рашэнні суда, судовыя выканаўцы ініцыююць увядзенне крымінальнай адказнасці. Такая мера ўжываецца цяпер да індывідуальных прадпрымальнікаў і юрыдычных асоб.

— Людзі бяруць вялікія крэдыты, афармляюць маёмасць на іншых, жывуць цудоўна, усім гэтым карыстаючыся, а ўзяць з іх няма чаго. І крыніцы заробкаў не выявіць. Каб выключыць магчымасць такіх выпадкаў і стымуляваць выплату грошай, трэба ўзмацніць механізм пакарання.

Патрабуе змен таксама працэдура паўторнага прад'яўлення дакументаў. Нават калі даказана, што ў даўжніка няма грошай на аплату доўгу зараз, гэта не перашкода для паўторнай прапрацоўкі яго судовымі выканаўцамі праз 3-6 месяцаў. Пры гэтым, эфектыўнасць паўторнай справы не больш за 10%.

**Ёсць справы, доўг у якіх складае 30-50 тысяч рублёў, прычым часам даўжнік нават не ведае, што ён камусьці вінен.**

### НЕ ВЕДАЕ, КАМУ ВІНЕН

У працы выканаўцаў ёсць справы, доўг у якіх складае 30-50 тысяч рублёў, прычым часам даўжнік нават не ведае, што ён камусьці вінен. Часцей за ўсё такія сумы па выканаўчых надпісах стараюцца спагнаць прадпрыемствы жыллёва-камунальнай гаспадаркі або аператары сотавай сувязі. Як правіла, даўжнікі па гэтых справах — асобы з асацыяльным ладам жыцця, якія не маюць пастаяннага месца працы, або людзі, якія з'ехалі ў доўгатэрміновую камандзіроўку. Нарэшце, існуе элементарная памылка ў разліках.

— Сродкі, якія мы трацім, каб спагнаць гэтыя мізэрныя сумы, эканамічна немэтазгодныя. Расходы на адну выканаўчую вытворчасць значна вышэйшыя. Толькі адзін заказны ліст даўжніку абыдзецца ў 25 000, а іх трэба накіраваць мінімум два. Дадайце яшчэ шэраг дакументаў — атрымаем мінімум 100 000. Вось вам і сума спагнання ў 50 000, — пракаментаваў судовы выканаўца. — Мы будзем абмяркоўваць з Беларускай натарыяльнай палатай пытанне, каб патрабавальнік абавязкова прыводзіў доказ, што даўжнік папярэджаны аб тым, што ён вінен грошы. Здараецца, што ў натарыяльныя канторы на афармленне выканаўчых надпісаў розныя службы звяртаюцца, не звяртаючыся папярэдне да даўжніка.

Каб за даўгі адной фізічнай асобы не прыйшлося разлічвацца яго сваякам, судовыя выканаўцы прытрымліваюцца паняццяў «агульная маёмасць» і «маёмасць, сумесна набытая ў шлюбе».

— Каб з кватэры, дзе жыве даўжнік, за яго даўгі не зніклі рэчы іншых жыльцоў, яны павінны даказаць, што маёмасць належыць ім. Гэта, напрыклад, могуць быць чэкі на аплату тавараў, набытых у крэдыт або растэрміноўку. Можна таксама сыходзіць з часу, калі даўжнік прапісаны ў кватэры. Калі ён там толькі пару гадоў, а мэбля, скажам, набыта ў савецкія часы, зразумела, што яму яна належаць не можа, — растлумачыў Андрэй Аўдзееў. — У законе не прапісаны дакладныя моманты адносна магчымасці высветліць, што належыць даўжніку, а што — не. І распрацаваць іх калісьці ў будучым таксама будзе немагчыма. Даўжнікі вельмі вынаходлівыя, і загадзя рыхтуюцца да прыходу выканаўцы. Прадстаўляюць доказы, што не валодаюць ніякай маёмасцю. Мы не зможам на кожны хітрык аператыўна выпрацаваць адпаведны заканадаўчы механізм.

Выканаўцы стараюцца ўздзейнічаць на даўжнікоў ускосна, праз нявыдачу ім крэдытаў, абмежаванне доступу да сотавай сувязі, тэлебачання або інтэрнэту.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*


zepter bank

**Закрытое акционерное общество «Цептер Банк»**

Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б
эл. адрес: info@zepterbank.by.
Тел.: 331 89 49, факс 331 89 48

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2016 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2016 | 01.04.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 49 093 | 23 581 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 96 444 | 51 142 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 52 118 | 39 518 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 211 526 | 274 632 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 441 629 | 285 887 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 93 062 | 63 450 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 12 347 | 1 535 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 38 919 | 19 760 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 995 138 | 759 505 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | 7 992 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 130 029 | 73 612 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 444 852 | 291 019 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 45 722 | 30 000 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 11 552 | 17 662 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 632 155 | 420 285 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 149 487 | 149 487 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 13 974 | 9 609 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 55 091 | 41 337 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 144 431 | 138 787 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 362 983 | 339 220 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 995 138 | 759 505 |

Председатель Правления Проворов Михаил Игоревич

Главный бухгалтер Михалевич Оксана Владимировна

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2016 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2016 | 01.04.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 23 543 | 18 414 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 6 628 | 12 995 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 16 915 | 5 419 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 298 | 3 418 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 431 | 309 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 867 | 3 109 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (84) | 61 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 10 654 | 62 335 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (171) | (464) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 18 571 | 31 143 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 15 889 | 945 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 24 244 | 12 824 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 474 | 540 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 781 | 26 898 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | - | 5 836 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 781 | 21 062 |

Председатель Правления Проворов Михаил Игоревич

Главный бухгалтер Михалевич Оксана Владимировна

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта:
**https://www.zepterbank.by/О-банке/Финансовая-отчетность/Ежеквартальныи-отчет.aspx**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 31 от 28.05.2013 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214.



# ЛЫЖЫ... ВЯСНОЙ

Памятаеце, як салдат, якога іграў Алег Даль у «Старой, старой казцы», падарыў капрызнай прынцэсе снег... улетку? Я, хоць і не прынцэса, але таксама нядаўна атрымала незвычайны сюрпрыз. На 8 Сакавіка муж падарыў мне... лыжы. «Ён у цябе з гумарам, — смяецца швагер. — Цяпер на Новы год чакай у падарунак купальнік».

Тата з дзяцінства называе мяне «іншапланецянкай». Маўляў, «усе дзяўчаты як дзяўчаты — хлопцы іх запрашаюць на спатканні. А да цябе едуць на матацыклах раіцца: як з кімсьці памірыцца, што камусьці падарыць... Ты так ніколі замуж не выйдзеш!» Тата і слухаць не хацеў пра сяброўства паміж хлопцам і дзяўчынай, казаў, што гэта адхіленне ад нормы.

Замуж я сапраўды выйшла па сучасных мерках позна — у 28 гадоў. Апошняя з аднакласніц. «Навошта перабіраеш, — увесь гэты час даймалі «добразычліўцы», якія, як правіла, жывуць далёка не так, як хацела б жыць я. — Вось засядзішся ў дзеўках, пасля нікому не патрэбная будзеш». Я толькі ўсміхалася ў адказ. Кожнаму свой час.

Сёння я дакладна ведаю, чаму мне так карцела трапіць два з паловай гады таму на Купалле ў Ракаў. Нават зламаны ровар і праліўны дождж не перашкодзілі. Угаварыла сябра паехаць туды на апошняй маршрутцы. Менавіта там — каля купальскага вогнішча ў карагодзе — я ўпершыню дакранулася да рукі будучага мужа. А пазней адчула, што з гэтым чалавекам можна рукацца душамі.

Што цікава, у нас супалі не толькі погляды на жыццё. Але і першыя тры літары прозвішчаў, і тры апошнія лічбы нумара пашпарта... Больш за тое, мы маем адзін дзень народзінаў на дваіх, любім вершы Рыгора Барадуліна і размаўляем па-беларуску. А нядаўна муж прызнаўся, што яго бацькі таксама з дзяцінства лічаць яго «іншапланецянінам». І дагэтуль не разумеюць, навошта ён прыцягнуў дадому са сметніка нікому не патрэбны калаўрот... Днямі мы сфармулявалі яшчэ адно супадзенне. І для мяне, і для яго самае важнае ў шлюбе — гэта сяброўства паміж мужам і жонкай.

Сёння я дакладна ведаю, што ўсе супадзенні ў жыцці не выпадковыя. Таму калі вам, як і мне некалі, скажуць «пасля нікому не патрэбная будзеш», не верце. Кожнаму свой час. Варта толькі ўмець чакаць і давяраць свайму лёсу, прыслухоўвацца да свайго сэрца, а не да чужых парад ды сухога разліку розуму. Бо свайго чалавека вы абавязкова адчуеце.

Нядаўна знаёмая расказала пра сваю аднакласніцу. «Таня дзесяць разоў пашкадавала, што выйшла замуж. Муж не дапамагае ні дома гаспадарыць, ні з дзеткамі ўпраўляцца. Для яго існуюць толькі рыбалка і сябры. Таня тэлефануе сваёй маці, плача, а тая — у адказ: «Што плачаш, бачылі вочы, што бралі, не трэба было замуж за яго выходзіць». Хоць да гэтага яна ўсе вушы пратрубіла дачцэ: «Калі ты ўжо замуж выйдзеш? Усе сяброўкі ўжо прыстроеныя...» Мудрыя ж людзі раяць: «Не варта чапляцца за кожныя штаны толькі таму, што потым замуж ніхто не возьме, бо няма нічога страшнейшага за адзіноту ўдваіх».

Калі ездзілі праведваць маіх бацькоў, муж папрасіў паказаць дом, дзе я правяла дзяцінства. У будынку, ад якога засталіся толькі сцены ды дах, мы знайшлі нашы з сястрой дзіцячыя цацкі, школьныя сшыткі, дзённікі, татавы вінілавыя пласцінкі... Прыхапіўшы апошнія, я выйшла на вуліцу. Праз некалькі хвілін паказаўся і шчаслівы Вова з маімі светла-ружовымі сандалікамі і дзіцячымі лыжамі ў руках. «Паглядзі, што я знайшоў, цяпер у мяне ёсць кавалачак дзяцінства маёй жонкі!» Бацькі, калі ўбачылі нас, радасных, з лыжамі ды сандалікамі, не зразумелі: «Навошта вам гэты «хлам»?» «Мы ж іншапланецяне, — аджартаваліся. — Нам патрэбна тое, што не патрэбна іншым».

Цяпер у нашай сям'і ёсць не толькі два калаўроты, але і дзве пары лыжаў. Пакуль толькі дзве. Бо я ўжо вырашыла, што падару гэтай вясной мужу на гадавіну нашага вяселля.

**Надзея ДРЫЛА-ДРЫНДРОЖЫК.**

**Сямейная газета**

Выпуск № 7 (50)

■ Тыя, хто побач

Андрусь ТАКІНДАНГ:

# «Я ВЫРАС У АТМАСФЕРЫ ЛЮБОВІ»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

**Буслы штогод ляцяць на зіму з нашай краіны ў больш цёплыя краі, ва Усходнюю Афрыку — Судан, Кенію, Уганду і... Чад. Напэўна, менавіта адтуль яны прынеслі на Лепельшчыну Андруся Такінданга, мастака, лідара гурта Recha (яго бацька акурат родам з Рэспублікі Чад). Падарылі нам не толькі таленавітага творцу, але і чалавека, які справамі і душой імкнецца ўзбагаціць родную для яго краіну. Андруся Такінданга яшчэ некалькі гадоў таму мог пабачыць кожны, каму не спіцца зранку ў будны дзень. Па тэлеканале АНТ у ранішняй перадачы ён вёў рубрыку «Беларуская мова», у якой расказваў гледачам пра слушнае выкарыстанне родных слоў, чым шчыра здзіўляў аўдыторыю. Сёння ён іграе ў гурце, а таксама добра вядомы па сваіх карцінах. У прыватнасці, па серыі абразоў «Крыжовы шлях». Андрусь прызнаецца, што яго поспехі — гэта вынік любові, з якой да яго ставіцца ўся сям'я.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Бацькам на заметку

# МІЛЫЯ І ПАДСТУПНЫЯ... ЗАБАЎКІ

## ЯК ВЫБРАЦЬ БЯСПЕЧНУЮ ЦАЦКУ?

**У дзяцінстве ўсё проста: табе падабаецца цацка і ты просіш яе ў бацькоў. Пасталеўшы, на выбар забаўкі для малых глядзіш па-іншаму: хочацца набыць не проста прыемны, але і бяспечны прэзент. Хто ведае, што «хавае» ў сабе прывабнае мяккае зайчаня? Дзеці вельмі чуллівыя да таксічных матэрыялаў, якія нярэдка выкарыстоўваюцца ў тым ліку і пры вытворчасці цацак. На што звяртаць увагу пры выбары падобных падарункаў? Як з імі абыходзіцца пасля пакупкі і ці мажліва вылічыць махлярства маркетолагаў? У гэтым нам дапамагала разбірацца кіраўнік праграмы па эка-дружным ладзе жыцця некамерцыйнай установы «Цэнтр экалагічных рашэнняў» Дар'я ЧУМАКОВА.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

# МУЖЧЫНЫ, ЯКІЯ НЕ ПЛАЧУЦЬ СЛЯЗАМІ, «ПЛАЧУЦЬ» КУЛАКАМІ...



**Калі вы думаеце, што толькі алкаголікі, дэбашыры ды судзімыя падымаюць руку на сваіх жонак, то моцна памыляецеся. Больш як 40% зваротаў на «гарачую лінію» для пацярпелых ад дамашняга насілля (8-801-100-8-801) — ад жанчын з забяспечаных і, на першы погляд, узорных сем'яў. Сярод ахвяр выкладчыцы ўніверсітэтаў, вядучыя тэлеканалаў, мастачкі, праграмісткі... Што тычыцца агрэсараў, то многія з іх займаюць высокія пасады. У чым карані праблемы? Як разгледзець у будучым мужу агрэсара? Чаму так важна, каб у нашай краіне з'явіўся асобны закон аб папярэджанні гвалту ў сям'і? Пра гэта і не толькі размаўляем са старшынёй праўлення міжнароднага грамадскага аб'яднання «Гендарныя перспектывы» Ірынай АЛЬХОЎКАЙ і кіраўніцай прытулку для ахвяраў дамашняга насілля Наталляй МАЛІКАВАЙ.**

## Прыніжаюць, каб самасцвердзіцца?

***— У нашым грамадстве замацавалася дакладная сувязь сямейнага гвалту і алкагалізму...***

**Ірына:** Проста асацыяльныя сем'і і тыя, у якіх муж злоўжывае алкаголем, больш на слыху. Але наша практыка паказвае, што вялікая колькасць агрэсараў — начальнікі, іх цудоўна характарызуюць калегі па працы. Бывае, уводзіш прозвішча мужа нашай кліенткі ў Google і думаеш: «Які цудоўны чалавек!» А ў гэты самы час ён такое вытварае ў сваёй сям'і. Пару гадоў таму да нас у офіс прыйшоў даволі вядомы ў вузкіх колах чалавек. Спрабаваў ачарніць сваю жонку. Казаў, што яна няўдзячная, паказваў здымкі рэчаў, якія ён ёй набываў: «Глядзіце, яна апранута, як цукерачка. У нас такая прэстыжная кватэра». Хацеў, каб мы сталі на яго бок. У нас жа не было сумневаў, што ён здзекаваўся з жонкі. Жанчына звярнулася да нас з пабоямі, была выпіска з судмедэкспертызы. У яе аповедзе — усе тыповыя прыёмы агрэсараў. На жаль, яна прайграла справу па абвінавачванні ў гвалце. Але трываць здзекі больш не стала: падала на развод і з'ехала ў іншую краіну.

***— Ёсць розныя віды гвалту: псіхалагічны, фізічны, сексуальны... Які з іх пераважае?***

**Наталля:** Псіхалагічны. Але ён амаль заўсёды папярэднічае фізічнаму. Праўда, нашы жанчыны не заўсёды могуць ідэнтыфікаваць псіхалагічны гвалт. Калі вы чуеце: «Ты дурніца, ні на што не здатная». Калі муж татальна кантралюе: дзе была, чаму вярнулася з працы на 20 хвілін пазней, чым звычайна... Некаторыя не расцэньваюць гэта як псіхалагічны гвалт. А дарэмна. Гэта і ёсць першыя званочкі.

**Ірына:** Многія нашы кліенткі (47% па даных «гарачай лініі») падвяргаліся эканамічнаму гвалту. Адной муж забараняў працаваць: казаў, што гэта не мае сэнсу, яе зарплата вельмі маленькая. Пры гэтым абмяжоўваў у грашах і кантраляваў усе выдаткі. Мог нават папракнуць, чаму яна купіла такі дарагі сок дзіцяці. Яшчэ адзін агрэсар у мэтах эканоміі перарэзаў правады інтэрнэту, адключыў ацяпляльны кацёл, забараняў карыстацца электрачайнікам. 20% жанчын, якія звярнуліся па дапамогу ў нашу арганізацыю, нават пасля разводу пакутуюць ад гвалту, у тым ліку і эканамічнага. Вельмі часта былыя муж і жонка вымушаны працягваць суіснаваць у адной кватэры ў розных пакоях. Адна кліентка расказвала, што яе сужыцель дэманціраваў унітаз. Пагражаў, што будзе разбіваць усе ўнітазы, якія яна ўсталюе. Другі мачыўся ў абутак былой жонкі. Трэці з'ядаў прадукты, якія стаялі ў агульнай лядоўні. Аднак сёння дзеянні такіх агрэсараў не падпадаюць пад азначэнне «гвалт у сям'і» . Таму мы прапануем, каб закон аб папярэджанні гвалту ў сям'і (а мы зацікаўлены ў тым, каб у нашай краіне з'явіўся такі закон. Яго маюць больш за 120 краін свету) распаўсюджваўся і на былых сужэнцаў, а таксама, каб у яго было ўключана паняцце эканамічнага гвалту.

***— А што тычыцца сексуальнага гвалту — у шлюбе ён, напэўна, з'яўляецца найбольш латэнтным?***

**Ірына:** Тут наогул такія дрымучыя стэрэатыпы! На жаль, у міліцыянераў таксама. Для многіх участковых згвалтавання ў шлюбе наогул не існуе (У Крымінальным кодэксе фармулёўка згвалтаванне ўключае згвалтаванне ў шлюбе. Але прэцэдэнтаў амаль што няма). Затое у нас ёсць такое паняцце як шлюбны абавязак. Вынікі даследавання, якое праводзілася па замове Фонду ААН у галіне народанасельніцтва ў Беларусі, паказалі, што 12% мужчын падвяргаюцца сексуальнаму гвалту ў сям'і. Я магу гэтыя лічбы патлумачыць толькі тым, што яны назвалі адмову ад выканання шлюбнага абавязку з боку жонкі сексуальным гвалтам. Маўляў, парушаюцца іх правы. Больш за тое, 14% мужчын, па гэтым жа даследаванні, лічаць, што яны маюць права мець інтымную блізкасць з жонкай нават калі знаходзіцца напаптіку. Нашы кліенткі расказваюць, што сексуальны гвалт агрэсары часта прымяняюць, каб паставіць кропку, прынізіць канчаткова.

**Бывае, уводзіш прозвішча мужа нашай кліенткі ў Google і думаеш: «Які цудоўны чалавек!» А ў гэты самы час ён такое вытварае ў сваёй сям'і.**

**Наталля:** Вельмі часта жанчына вінаваціць сябе. Бо шмат гадоў муж яе пераконваў, што яна дрэнная, непрыгожая. Да нас звярталася маладая дзяўчына з 2-гадовым дзіцем на руках. Кажа: «Ну падам на развод, і каму я, акрамя яго, буду патрэбная». Муж-агрэсар так даняў яе, што яна ў свой 21 год ужо не бачыць далейшай перспектывы ў адносінах з супрацьлеглым полам.

## Да пагрозаў трэба ставіцца сур'ёзна

***— Нярэдкія сітуацыі, калі жонка піша заяву ў міліцыю, а праз дзень вяртаецца і забірае яе. Такім чынам муж-агрэсар выходзіць сухім з вады. Магчыма, нам варта было б пераняць замежны вопыт, калі справа заводзіцца незалежна ад таго, забярэ ахвяра дамашняга насілля сваю заяву ці не?***

**Наталля:** У мужа адной з нашых кліентак два адміністрацыйныя прыцягненні за год. «І ён ні адзін штраф не аплаціў, — скардзілася яна. — Я баюся, што прыйдзе судовы выканаўца і забярэ наш агульны камп'ютар, на якім дзеці ўрокі робяць, ці пральную машыну». Яна разумее, што пацерпіць яшчэ больш, калі не забярэ заяву. Таму штрафы ў адносінах да агрэсара — неэфектыўная мера, бо плаціць сям'я.

**Ірына:** Забіраюць свае заявы яны яшчэ і таму, што баяцца. Муж пагражае: забірай, інакш прыб'ю ці адбяру ў цябе дзяцей. Ніхто не можа даць гарантыі, што ён гэтага не зробіць. Таму я лічу, што наогул не павінна быць прывязкі да заявы жанчыны, каб любая сітуацыя гвалту расследавалася незалежна ад яе жадання. У многіх краінах, каб справа была заведзена, дастаткова заявы спецыяліста, суседзяў, бацькоў, якія ведаюць, што іх дачка ў бядзе. Больш за тое, важна, каб праваахоўныя органы рэагавалі нават на пагрозы здзяйснення гвалту. А у нас часам як атрымліваецца: жанчына прыйшла ў міліцыю, а ёй участковы кажа, што няма ніякіх доказаў. Яна трывае, а гвалт расце.

**Наталля:** Муж-агрэсар працягвае запалохваць сваю жонку, маніпуляваць ёй. Гэта часта прыводзіць да таго, што яна нікуды не звяртаецца. Пакуль не наступае сітуацыя, напрыклад, што ён яе пачынае душыць, жанчына абараняецца, ударае патэльняй, ножыкам ці яшчэ чымсьці. Невырашэнне сітуацыі, калі б'юць гадамі, прыводзіць да таго, што мы маем жаночую злачыннасць.

***— У якім выпадку можна захаваць сям'ю?***

**Наталля:** Ёсць два шляхі: альбо разыходзіцца, альбо абаім працаваць над сабой. Калі мы працуем толькі з кліенткай, а яе муж-агрэсар і не думае мяняцца, то праз месяц-два ў нас бываюць паўторныя засяленні гэтых жанчын...

**Ірына:** Павінны быць прымусовыя выпраўленчыя праграмы для агрэсараў. У Ізраілі, ЗША, калі ты на працягу паўгода не прапускаеш карэкцыйныя заняткі, то маеш магчымасць знізіць сабе пакаранне. Прычым тыя спецыялісты, якія працуюць з ахвярамі гвалту, не павінны працаваць з агрэсарамі. Я лічу, што з такімі мужчынамі павінны працаваць псіхолагі-мужчыны. Гэта пытанне даверу.

## Я адчуваю. Я думаю. Я раблю

***— Што б вы маглі параіць незамужнім дзяўчатам? Напэўна, можна неяк разгледзець у жаніху будучага агрэсара?***

**Наталля:** Ёсць моманты, на якія варта звярнуць увагу. Як правіла, мужчыны, схільныя да гвалту, стараюцца вельмі хутка ўзаконіць адносіны. Таксама варта задумацца, калі ўбачылі, што хлопец штурхнуў нагой сабаку. Звяртайце ўвагу і на паталагічную рэўнасць. Многія нашы кліенткі прызнаваліся: «Яго першая жонка гаварыла, што развялася з ім, бо ён яе біў». Часцей за ўсё, такія мужчыны, як толькі жанчына разрывае з ім адносіны, шукаюць новую ахвяру. Як правіла, агрэсар пачынае падымаць руку на жонку не ў першы год сумеснага жыцця. Спачатку паступова спрабуе звузіць яе кола зносін да мінімуму, па сутнасці толькі да яго. Вядома, калі ты рэдка бачышся з сяброўкамі, то ў адзін цудоўны дзень патэлефануюць ім і сказаць: «Прытулі мяне з дзеткамі, бо мяне б'е муж», мала хто адважыцца. Важна, каб першы выпадак не прайшоў незаўважаным. А то, як у нас звычайна бывае: мужчына падарыў кветкі са словамі «Я сарваўся, прабач, у мяне складаны перыяд, больш гэта не паўторыцца». Жанчыне трэба адразу даць зразумець, што здзек трываць не будзе: «Калі гэта паўтарыцца, я ад цябе сыду». І ўсё, што яна абяцае, павінна выконваць. Як правіла, большасць жонак кажа «я выклічу міліцыю», «падам на развод» і забірае заяву альбо нічога не робіць. Або, як у нас была сітуацыя, паўторна ўступае ў шлюб з гэтым мужчынам. Агрэсары ж адчуваюць сваю беспакаранасць і гвалт ідзе па нарастаючай.

***— Чаму мужчыны прымяняюць гвалт у адносінах да сваіх жонак?***

**Наталля:** Такім чынам мужчына спрабуе ўстанавіць кантроль над жанчынай. Каб яна рабіла тое, што ён хоча, паводзіла сябе, як ён хоча. Каб у яе не было свайго меркавання, свабоды ў паводзінах. «Ты не працуеш, у сям'ю нічога не прыносіш. Чаму ў цябе павінна быць права голасу». Для многіх мужчын гвалт у адносінах да жонкі — гэта магчымасць самасцвердзіцца.

**Жанчыне трэба адразу даць зразумець, што здзек трываць не будзе: «Калі гэта паўтарыцца, я ад цябе сыду». І усё, што яна абяцае, павінна выконваць.**

**Ірына:** Самасцвярджэнне праз сілу — гэта не прыкмета сапраўднага мужчыны. Таты павінны сваім дзецям дэманстраваць іншую мадэль паводзінаў. Мужчына не толькі той, хто прымае ўсе рашэнні і зарабляе грошы, ён таксама можа памыць посуд, запячы нешта ў духоўцы. Часта ў сем'ях няма таты. Тады хлопчыкі сацыялізуюцца па сцэнарыі: «Я — не дзяўчынка. А гэта значыць — я не пяшчотны, не клапатлівы, не спачуваю, не плачу, не скарджуся, я ўсё трымаю ў сабе». Але сацыёлагі падчас даследаванняў прыйшлі да высновы, што мужчыны, якія не плачуць слязамі, плачуць кулямі. Ці кулакамі.

***— Магчыма, корань гвалту ў павярхоўнасці адносін? У тым, што муж і жонка не прагаворваюць крыўды, адчуванні, не спрабуюць паглыбіцца ва ўнутраны свет адно аднаго, стаць на месца другога?***

**Ірына:** Па апытаннях школьнікаў, шлюб — гэта суцэльныя ружовыя соплі, букеты, цукеркі. А тое, што гэта праца, кампраміс... Дзе гэтаму вучаць? Адсюль і няўменне выказваць свае пачуцці. А не біць, калі ты не згодны з пунктам гледжання жонкі. У псіхалогіі прымяняецца методыка трохкутніка: «Я адчуваю. Я думаю. Я раблю». Я была на экскурсіі ў шведскім садку. Там вучаць 5-гадовых дзяцей гаварыць пра свае пачуцці па гэтым трохкутніку. Забраў хлопчык у дзяўчынкі цацку. «Леначка, не бяжы скардзіцца выхавальніцы, дай Пецю зразумець, што ён цябе пакрыўдзіў. Раскажы яму, што ты адчуваеш пасля таго, як ён забраў у цябе цацку». — «Гэта мая любімая цацка, я адчуваю сябе адзінокай». — «А ты, Пеця, чаму забраў у Леначкі цацку? Што ты адчуў, пасля таго, як яна табе расказала пра свае адчуванні?». Вось чаго нам не хапае. Трэба гаварыць «я сябе адчуваю пакінутай», замест таго, каб штосьці зрабіць на зло, альбо ігнараваць, караць маўчаннем. «Я цяпер з табой не размаўляю», — гэта для нас больш звыклы спосаб. У беларусаў, на жаль, пакуль нізкая культура сямейных адносін. Магчыма, калі б яна была вышэйшай, гвалту было б меней.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

МЕРКАВАННЕ

## «ТОЛЬКІ АСОБНЫ ЗАКОН ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД»

**Алег КАРАЗЕЙ, начальнік упраўлення прафілактыкі Галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі:** «Цяпер у нас існуе закон «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў». У ім прапісаны і меры, якія тычацца непасрэдна прафілактыкі дамашняга насілля: якім чынам выносяцца афіцыйныя папярэджанні, ахоўныя прадпісанні, парадак пастаноўкі на прафілактычны ўлік. Але гэтага мала. Каб вырашыць праблему, трэба комплексны падыход. Міністэрства ўнутраных спраў зацікаўлена ў тым, каб быў прыняты асобны самастойны нарматыўна-прававы акт, які будзе рэгламентаваць пытанні выключна дамашняга насілля. Там павінны быць прапісаны механізм міжведамаснага ўзаемадзеяння органаў і ўстаноў, адказных за выяўленне фактаў гвалту ў сям'і, аказання дапамогі ахвярам і прыцягнення віноўнікаў да адказнасці. Перш-наперш, трэба канкрэтызаваць фармулёўку, што такое дамашняе насілле. Міжнародны вопыт сведчыць аб тым, што пад ім падразумяваецца супрацьпраўныя дзеянні не толькі членаў сям'і, але і былых членаў сям'і. Гэта могуць быць былыя муж і жонка, дарослыя дзеці, якія прыходзяць да сваіх бацькоў і забіраюць у іх грошы. Некалькі гадоў таму мы распрацавалі законапраект аб папярэджанні гвалту ў сям'і. Летась Вярхоўны суд і Генпракуратура зрабілі некаторыя заўвагі па яго змесце і вярнулі нам яго на дапрацоўку. У бягучым годзе плануем улічыць усе заўвагі і ўдасканаліць законапраект.

# МІЛЫЯ І ПАДСТУПНЫЯ... ЗАБАЎКІ

## «МАХІНАЦЫІ» НА ЭТЫКЕТКАХ

Разам з экспертам мы выправіліся ў сапраўднае цацачнае «царства» — аддзел «Дзіцячы свет» сталічнага ЦУМа.

— Наглядзеўшы цацку, перш-наперш прачытайце этыкетку, — тлумачыць Дар'я. — На ёй мусіць стаяць найменаванне «цацка» альбо «выраб для гульнявых мэтаў». Звычайная маска, як высветлілася, з'яўляецца «аксесуарам карнавальным» і да цацак яна не мае ніякага дачынення. Чаму гэта важна? Па заканадаўстве такі тавар не з'яўляецца цацкай, а значыць, калі ўзнікнуць прэтэнзіі, патрабаванні да яго будуць іншыя.

Важна правяраць вытворцу, а таксама тэрмін службы кожнай забаўкі. У многіх сем'ях павялося, што цацкі перадаюцца ў спадчыну ад старэйшага дзіцяці да малодшага. Падаецца, экалагічны крок: рэччу карыстаюцца. Але! «Састарэлы» пластык паступова разбураецца, таму яго трэба своечасова ўтылізаваць, каб ён не нашкодзіў малому. Тое ж датычыцца забавак, зробленых з іншых матэрыялаў.

Расшыфроўваем маркіроўку. Самы важны знак для бацькоў — гэта ўзроставае абмежаванне.

— На цацках, прызначаных для дзяцей ад нуля да трох гадоў, абавязкова ўказваецца склад. У іншых выпадках вытворца можа не пазначаць гэтую інфармацыю, — кажа Дар'я. — Многія мамы сутыкаюцца з наступнай сітуацыяй. Набываючы цацку для дзіцяці, якому яшчэ няма трох гадоў, знаходзяць тую, якая візуальна падыходзіць пад гэты ўзрост. Праўда, на забаўцы стаіць пазнака «ад трох і старэйшых». Нядобрасумленныя вытворцы хітруюць, каб не ўказваць састаў тавару і не выконваць больш жорсткія заканадаўчыя патрабаванні. Гэта значыць, цалкам магчыма, што ў саставе такой цацкі ёсць небяспечныя для здароўя дзіцяці складнікі.

«ЕАС, «СТБ», «РТС», «УКРСепПРО» — не проста абрэвіятуры, а знакі адпаведнасці заканадаўству Мытнага саюза, Беларусі, Расіі і Украіны. Аднак ёсць маркіроўкі падобныя як дзве кроплі вады.

— «С Е» (Conformite Europeenne) — знак адпаведнасці тавару заканадаўству Еўрапейскага саюза. Гэта вельмі якасны маркер, але яго лёгка зблытаць з кітайскай пазнакай «СЕ» (China Export), — адзначае Дар'я. — Розніца паміж дзвюма маркіроўкамі толькі ў інтэрвале паміж літарамі: С і Е ў «фальшыўцы» стаяць бліжэй адна да адной, чым у сапраўдным знаку адпаведнасці ЕС. Некаторыя вытворцы карыстаюцца гэтым падабенствам, падмяняючы адзін знак іншым, бо кітайскае заканадаўства не такое жорсткае ў параўнанні з еўрапейскім.

## ЯКОЕ ДРЭВА ГОРШАЕ ЗА ПЛАСТЫК?

Разглядаючы стэлажы, заваленыя канструктарамі, машынкамі, лялькамі, пазламі, няцяжка здагадацца, што цацкі часцей за ўсё вырабляюць з пластыку, драўніны альбо сінтэтыкі. З пластыкам трэба быць асцярожным: часам ён бывае небяспечным.

— Умоўна пластык можна падзяліць на дзве вялікія групы. Дзіцячыя канструктары, кубікі, вядзерцы і рыдлёўкі робяць з цвёрдага пластыку: поліпрапілен (пазначаецца лічбай «5», поліэтылен высокай і нізкай шчыльнасці (адпаведна пад нумарамі «2» і «4») і полівінілхларыд (таксама вядомы як ПВХ, лічба «3»). Самы бяспечны з іх — поліпрапілен. А ПВХ, наадварот, не надта ўдалы матэрыял для дзіцячых цацак. Ён выдзяляе таксічныя элементы, а ўлічваючы, што ў дзіцячым пакоі можа знаходзіцца некалькі цацак з ПВХ, рызыка ўзрастае, — гаворыць эксперт. — Да другой групы пластыкаў адносіцца мяккі пластык ПВХ-пластызоль. У яго дадаюць розныя пластыфікатары, дзякуючы якім цацка становіцца эластычнай, яе можна сціскаць. Аднак пластызоль можа змяшчаць у сабе фталаты (хімічныя рэчывы, якія здольны парушыць функцыянаванне эндакрыннай і рэпрадуктыўнай сістэм). Дзецям да года не рэкамендуецца гуляць з цацкамі, зробленымі з гэтага матэрыялу. Увогуле, спецыялісты раяць абмяжоўваць кантакт дзяцей з падобнымі забаўкамі.

Асартымент драўляных цацак у параўнанні з пластмасавымі проста мізэрны.

У асноўным на палічках можна ўбачыць наборы для мадэлявання і канструявання. У цацачнай вытворчасці выкарыстоўваюцца суцэльная драўніна і фанера. Настольная гульня джэнга зроблена з суцэльных брускоў дрэва, а мадэлі для канструявання — з фанеры. Неаднародны склееены матэрыял небяспечны тым, што дзеці могуць яго раскалупаць альбо разгрызці. Дар'я раіць звяртаць увагу на афарбоўку і пакрыццё лакам: гэтыя рэчывы могуць утрымліваць у сабе прымесі фармальдэгідаў (выклікаюць алергічныя рэакцыі, адмоўна ўздзейнічаюць на слізістую абалонку). Лепшы выбар — цацка з суцэльнай драўніны, якая дадаткова нічым не апрацавана.

Цацкі з сінтэтыкі бадай самыя папулярныя — цяжка «не растаяць», разглядваючы мяккіх мядзведзікаў, кацянят, парсючкоў і іншых прадстаўнікоў фаўны. Як правіла, яны зроблены са штучнага футра (паліэстэр) і дадаткова ўпрыгожаны рознымі дэкаратыўнымі элементамі.

**«Састарэлы» пластык паступова разбураецца, таму яго трэба своечасова ўтылізаваць, каб ён не нашкодзіў малому.**

— Практычна ўсе мяккія цацкі не рэкамендаваны для дзяцей, якім менш за тры гады, — выдае «сакрэт» эксперт. — Але што адбываецца ў дзіцячых пакоях? Нават у нованароджаных ёсць свой мяккі «звер», з якім дзіця не гуляе. Лепей адмаўляцца ад іх да той пары, пакуль малое не падрасце. Мала таго, што ў саставе мяккай цацкі могуць быць таксічныя матэрыялы, дык яны самі па сабе назапашваюць шмат пылу і бруду, якія змяшчаюць у сабе таксічныя элементы.



Будзьце асцярожныя з забаўкамі, зробленымі з «мяккага» пластыку: яны змяшчаюць у сабе фталаты.




Савяня — цалкам экалагічны падарунак, зроблены з натуральных матэрыялаў.




Этыкетка — пашпарт любой цацкі.

Фота Надзеі БУЖАН.

**Для таго, каб мяккі «цуд» не ператварыўся ў пылазборнік, варта мыць цацку раз у два месяцы. Калі яе нельга праць у машыне, апрацоўвайце мыльнай пенай і працірайце анучкай. Для прафілактыкі ад пылавога кляшча цацку трэба пыласосіць, а пасля прасушыць на сонцы альбо ахаладзіць у маразільніку.**

**Мяккую цацку варта апрацаваць адразу ж пасля пакупкі. Для забавак з іншых матэрыялаў «чыстка» таксама важная: гэта паказвае, наколькі выраб бяспечны для малога. Калі цацку дазваляецца мыць у цёплай вадзе, значыць, яна добра афарбавана і кантакт з вадой ёй ніяк не нашкодзіць (гэта істотна, бо дзеткі любяць спрабаваць цацкі на «смак»). Калі ж цацку можна толькі апрацаваць вільготнай анучкай, значыць, на ёй ёсць дэталі, якія могуць стаць небяспечнымі ў руках малога.**

## ЧЫМ ПАВІННА ПАХНУЦЬ ЦАЦКА?

Заўважаем парася з тэкстылю, на пузе якога красуецца ліпкі прынт. Падобныя прымочкі з ПВХ не падыходзяць для дзетак, якія спрабуюць цацкі на смак. Затое швы на парасяці аказаліся ў парадку. Увогуле, на паверхні цацкі не павінна быць сколаў, слядоў клею, вострых краёў і вуглоў. Этыкетку Дар'я раіць адразаць адразу ж пасля набыцця, каб дзіця выпадкова не парвала забаўку, цягаючы яе за «хвосцік».

Музычныя цацкі хаваюць небяспеку ўнутры. Невялікія круглыя батарэйкі лёгка дастаюцца, і гуляючы, малое можа проста іх праглынуць. Эксперт раіць аддаваць перавагу цацкам без батарэек, альбо сачыць за тым, як дзіця гуляе з такой забаўкай.

Нам трапляецца ліпкая навобмацак упакоўка, вельмі падобная да жаночай касметычкі. З гэтым «зверам» мы ўжо знаёмыя — гэта ПВХ-пластызоль. Хоць упакоўка выглядае вельмі прывабна, захоўваць цацкі лепш за ўсё ў драўляных, кардонных альбо палатняных скрынях. Калі прыглядзецца ўважліва, то на многіх упакоўках можна заўважыць пазнаку «упакоўка цацкай не з'яўляецца»: яе трэба ўтылізаваць адразу пасля распакоўкі.

Дарэчы, калі, распакаваўшы забаўку, вы адчулі ад яе моцны пах — можаце вярнуць выраб у краму як няякасны тавар.

— Цацка, прызначаная для дзяцей да трох гадоў, увогуле не павінна пахнуць. У іншых выпадках дапушчальны пах агульным балам «2»: гэта значыць, спажывец можа выявіць яго, толькі калі добра прынюхаецца, — адзначае Дар'я.

Кожная цацка мае свой сертыфікат адпаведнасці: у краме вам абавязаны прадаставіць яго па запатрабаванні цягам 5 дзён. Усе прэтэнзіі па цацках прымаюцца толькі пры наяўнасці ўпакоўкі.

У канцы шпацыру эксперт-эколаг знайшла цацку, якая цалкам яе задаволіла: савяня, пашытае з ільну, унутры набітае вішнёвымі косткамі. Аднак, на жаль, забавак з натуральных матэрыялаў у асартыменце крамы вельмі мала. Але ў наступных нумарах «Сямейнай газеты» мы абавязкова распавядзём, што такое экалагічная цацка і ці магчыма яе зрабіць сваімі рукамі.

**Кацярына РАДЗЮК.**

*Аўтар выказвае падзяку адміністрацыі ЦУМа за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыяла.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

■ Вазьму твой боль...

# РАЗВУЧЫЦЦА ЛЮБІЦЬ




**Чытаю тэкст пра тое, што псіхолагі, хочаш не хочаш, з-за сваёй практыкі становяцца чэрствымі. Чэрствасць — прамое наступства гіперадчувальнасці. Калі цэлымі днямі на рабоце пражываеш розныя пачуцці — стамляешся. І калі ў звычайным жыцці, па-за межамі працоўнага кабінета, псіхолаг назірае складаную сітуацыю, ён застаецца назіральнікам. Мінуць не можа, бо гуманіст. Але і ўмяшацца таксама: «скура» баліць. І кожны радок адгукаецца ўва мне, кожнае напісанае тут слова варта адрасаваць і валанцёрам.**

Ты пачынаеш дапамагаць людзям, таму што спачуваеш ім, перажываеш за іх, таму што неабыякавая. Спачатку ты прапускаеш усё праз сябе. Спачуваеш, перажываеш і пражываеш. Калі «скура» аблазіць і эмоцыі тыкаюць у голае «мяса», тваё цярпенне заканчваецца. Ты вырашаеш адгадаваць новую «скуру», а пакуль — фільтраваць эмоцыі. Хочаш пазбавіцца ад чужых перажыванняў. Ты гатова не перажываць і не пражываць за іх. Але вось у чым праблема: эмоцыі такія неразумныя, яны лезуць, як маленькія кацяняты, і зусім не ўмеюць падзяліцца на свае і чужыя. Ты ім: «Апсік!». І ўсё. Няма эмоцый, як ты прасіла.

Спачатку ты задаволеная. Нарэшце цішыня, спакой і нейтралітэт. Ты забаўляешся сваёй ураўнаважанасцю. Пазбавіўшыся ад эмоцый, спакойна звяртаешся да розуму. У вас з ім узаемаразуменне. Ніхто не замінае. Ты спакойна дапамагаеш іншым і паралельна жывеш сваім жыццём.

Ты заводзіш сям'ю сваёй мары. Але больш не разумееш, чаму так доўга пра яе марыла. Яна не дае радасці, шчасця, напоўненасці і любові. Не, ты разумееш, што рада і любіш. Разумееш. Але не адчуваеш.

Ты расцеш і змяняешся, у цябе з'яўляюцца новыя магчымасці, спраўджваюцца жаданні. Ты будуеш планы і не разумееш, для чаго. Ідзеш па шаблоне. Ты ведаеш, што кахаеш, але не адчуваеш кахання. Ты марыш, але не радуешся ажыццяўленню сваіх мар.

Ты цярпіш страты, паражэнні, расстанні і здраду. А яны не кранаюць цябе, не баляць. На агаленым месцы даўно нараслі «скураныя пласты», надзейныя, удвая таўсцейшыя за мінулыя. Гэта твая браня. Ад жалю, скрухі, болю і расчараванняў. Ты ведаеш, што яны ёсць. Але не адчуваеш. І ты лічаш сваё цудоўнае ператварэнне найлепшым са здарэнняў.

Ты ведаеш, што любіш сваю сям'ю. Чаго яшчэ хацець? Дастаткова ведаць і жыць далей. І ты жывеш. Пашыраеш кола сям'і. Ты сустракаешся з сынам, які толькі што прыйшоў у гэты цудоўны свет розуму. Ён кволенькі, безабаронны, ляжыць на тваім жываце і зазірае сваімі напалову прыкрытымі вочкамі проста ў цябе. Ты сустракаешся з ім позіркам і... нічога не адчуваеш.

Ты думаеш, што любіш яго. Корміш, мяняеш падгузкі, носіш слупочкам да першай адрыжкі, калыхаеш на руках, пераапранаеш бодзікі, чытаеш мамскія форумы, буськаеш пульхныя шчочкі. І нічога не адчуваеш.

Я прайшла ўвесь твой шлях. Разам з табой. Мне давялося доўга шукаць твае пачуцці і разбірацца ў прычынах іх сыходу. Я не адразу звязала гэта з садранай «скурай». Шлях да эмоцый аказаўся доўгім. Але мы зрабілі гэта разам. Адшукалі іх. Цяпер ты ўгаворваеш іх вярнуцца. Пакрыўджаныя пачуцці нясмела, па чарзе высоўваюцца з-за высокай брамы. Бывае, заходзяць у госці. Але кожны раз ізноў вяртаюцца ў выгнанне, за калючы дрот, куды ты іх спаслала. Яны бачылі здраду і не вераць, што ты гатова прыняць назад. Ты і сама не верыш.

Кожны раз, калі на гарбату заходзіць Любоў, тваё сэрца трымціць ад страху згубіць яе. Праз акно ты бачыш чаргу каля сваіх дзвярэй: Расстанне, Страта, Боль, Адчай... Табе не хапае паветра, а сэрца стукае так моцна, што Любоў палохаецца і хаваецца за Думку. І ты ніяк не можаш выбраць: любіць ці думаць, што любіш.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА, заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000».**

# «Я ВЫРАС У АТМАСФЕРЫ ЛЮБОВІ»



«Дзівімся з бабуляй у цуда-камеру», — так падпісаў гэты здымак у сацсетках Андрусь.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ»)*

***— Нізашто не паверу, што ў дзяцінстве ты быў неспакойным хлопцам.***

— Калі быў малы — так. Дзіцем часта сваволіў, бацькі мяне мусілі пастаянна супакойваць. Я, праўда, гэтага не памятаю, ведаю толькі па аповедах. Я так гарэзнічаў, што бацька мяне браў на рукі, садзіўся ў таксі і ездзіў па горадзе доўга-доўга, каб я там трохі засынаў. Карацей, шмат клопату прыносіў навакольным. Калі скончаў наведваць садок і пачынаў хадзіць у школу, мы пераехалі жыць у вёску, тады больш ці менш супакоіўся. Тут хутчэй ва ўзросце справа.

***— У чым для цябе бацькі — прыклад?***

— Мой бацька — ураджэнец Чада, маці — з-пад Лепельшчыны. Калі яны пазнаёміліся, пэўны час жылі разам, пасля надоўга рассталіся, а праз шмат гадоў зноў сышліся. У наш час, калі людзі захоўваюць адно аднаму вернасць ад адлегласці і на працягу вялікага часу, то гэта выклікае павагу. На жаль, мой бацька памёр, але апошнія гады яны з маці пражылі адной сям'ёй. Для мяне бацькі — прыклад вернасці і трываласці кахання.

***— Як лічыш, пэўныя здольнасці перадаюцца дзіцяці, ці гэта вынікі слушнага выхавання?***

— У мяне асаблівых здольнасцяў няма, як у чалавека-павука ці ў супермэна *(смяецца)*. Чаму я навучаўся на мастака, займаюся музыкай? Усё гэта было б цяжка рабіць без падтрымкі сям'і. Музыка і мастацтва — гэта заняткі, якія патрабуюць шмат часу і паразумення навакольных. Таму што цяжка нешта ствараць, калі ты не знаходзішся ў прасторы любові. Для мяне, прынамсі, гэта немагчыма. Калі такая прастора ствараецца сярод сваякоў, тады ёсць магчымасць і жаданне быць творцам. Мастацтва патрабуе творчасці, а творчасць — любові. Я выхоўваўся ў любові, таму ўсе мае песенькі і карцінкі — гэта вынікі ўзаемаадносін радавых, сямейных. Мой дзядуля быў настаўнікам фізікі, але любіў спяваць, іграў на гармоніку ды баяне. У маладосці ў яго нават быў свой гурт. Бабуля мая дагэтуль любіць спяваць і слухаць музыку. Вядома, гэта таксама паўплывала на мае цікавасці ў жыцці. Калі ў мяне былі творчыя памкненні, то гэта заўжды заахвочвалася, падтрымлівалася.

**«Ці ты зарабіў тысячу долараў, ці патраціў іх — родныя ўсё адно на тваім баку. Гэта дазваляе рухацца наперад насуперак свайму гультайству, дэпрэсіі і адчаю».**

Мастацтва, музыка — гэта заняткі несур'ёзныя, нейкае блюзнерства ды блазнота. Крыўляешся ды пэндзлем пэцкаеш нешта. Здараецца, цяжка сябе прыняць такім. Ці гэта патрэбна каму-небудзь, ці гэта дадае добрай энергіі ў свет, ці гэта толькі ў тваёй галаве? Усё так адносна. Таму важна ведаць, што ёсць людзі, якія цябе прымаюць з хібамі і «прусакамі» ў галаве, могуць сказаць: «Не перажывай, супакойся, мы з табой незалежна ад таго, атрымалася карціна ці не». Ці ты зарабіў тысячу долараў ці патраціў іх — родныя ўсё адно на тваім баку. Гэта дазваляе рухацца наперад насуперак свайму гультайству, дэпрэсіі і адчаю. Дзякуючы адчуванню любові я ёсць той кім я ёсць.

***— Як можна навучыцца любіць?***

— Гэтаму мы мусім вучыцца ўсё жыццё, і ўвесь час прайграваць. Тут няма выдатнікаў. Таму што ўсе мы людзі і робім памылкі. Часам ранім іншых, часам сябе не ўмеем любіць, паважаць, таму робім балюча навакольным. Гэты ўрок працягваецца штодня, і ён не завершыцца ніколі, я спадзяюся. Школа любові — гэта доўгі шлях ва ўзаемаадносінах людзей. Ці ў стане ты палюбіць сваіх сваякоў, сяброў, а затым — і ворагаў?

***— Што ты хацеў бы перадаць сваім дзецям?***

— Прывітанне! *(Смяецца.)* А калі сур'ёзна, мая сям'я мяне вучыла, што важна быць добрым чалавекам незалежна ад прафесіі і заробку, ад няўдач ці поспехаў. І шчаслівым!

**«Па мне, вернік — гэта той, хто шмат у чым змагаецца з Богам. А Бог яго за гэта яшчэ больш падтрымлівае».**

Ёсць паспяховыя людзі, але няшчасныя. А ёсць небагатыя, але шчаслівыя ў тым, чым яны займаюцца, у тым, як сябе адчуваюць. Гэта вялікая навука. Шмат у чым шчасце магчымае дзякуючы людзям, блізкім да нас. Калі нас любяць, прабачаюць нам і прымаюць, а мы адказваем тым жа — вось яно, відавочнае шчасце.

***— У сацыяльных сетках у цябе не так шмат здымкаў з бацькамі і сябрамі, колькі з бабуляй.***

— Бо яны карыстаюцца найбольшай папулярнасцю. Бабулі маёй гэта вельмі прыемна. Таму яны там ёсць. Мая бабуля — асаблівы чалавек. Майго добрага знаёмага, Клаўдзія Гуджэроці, які быў на працягу апошніх гадоў апостальскім нунцыем у Беларусі, вельмі цікавіў генатып, асаблівасці нашага народа. Ён некалькі гадоў назіраў і аналізаваў беларусаў. І прыйшоў да такой высновы: у Беларусі людзі старэйшага пакалення больш шчаслівыя, жыццярадасныя і аптымістычныя за моладзь. І калі гэтак будзе працягвацца, у нас не будзе будучыні, лічыць ён. А мая бабуля — гэта ўвасабленне жыццярадаснасці, цвёрдасці ў перакананнях. Яна ведае адназначныя адказы на ўсе пытанні. І гэта прыгаломшвае. У свае 86 гадоў захоўвае цвярозы розум. У ёй столькі энергіі! Яна б магла быць прэзідэнтам, дакладна! *(Смяецца.)*

***— Ведаеш, часам вельмі прыкра робіцца, калі бачу, што некаторыя беларусы саромеюцца свайго паходжання, роднай мовы. Ёсць такія, што за мяжой кажуць усім, што яны рускія.***

— Напэўна, ідэнтыфікацыя шмат у чым залежыць ад узроўню адукаванасці. Тваё культурнае поле стварае колькасць прачытаных кніг, наведаных імпрэзаў... Узровень асветы робіць чалавека больш багатым. Тым больш, толькі калі ведаеш беларускую культуру, зможаш атрымліваць задавальненне ад яе.

***— Каштоўнасці накшталт мовы ці веры ў Бога, перадаліся табе ад бацькоў ці здабыў іх самастойна?***

— Маці ў мяне беларускамоўная, і таму беларуская мова для мяне матчына. Бабуля — настаўніца рускай мовы і літаратуры. Яна часта кажа: «Ну давай, Андрусёчак, напішы ўжо песню на рускай мове». Што тычыцца веры, то прабабуля Вікторыя, Вікцяй яе называлі (я яе, на жаль, не заспеў), была моцна веруючай, але замужам за атэістам. Вучыла маю маці маліцца, але поспеху гэта не займела. Мая бабуля толькі цяпер прыйшла да Бога. Ды і я сам прыняў хрост у свядомым узросце.

**«Ёсць паспяховыя людзі, але няшчасныя. А ёсць небагатыя, але шчаслівыя ў тым, чым яны займаюцца, у тым, як сябе адчуваюць. Гэта вялікая навука».**

Паколькі я хрысціўся ў 10 гадоў, то добра памятаю, як усё адбывалася. Мы хрысціліся адначасова з маці. Гэта ўвогуле быў такі час, калі цікавасць да рэлігіі ў нашай краіне пачала адраджацца. Добра памятаю, што першы дзень пасля хрышчэння я быў нібыта ў стане палёту. Хадзіў і фізічна адчуваў, што не дакранаюся да зямлі. І маці сказала, што яна адчувала тое. Хоць сам абрад прайшоў сціпла і проста... Да таго моманту я не давяраў ні Богу, ні Царкве, трымаўся на ўнутранай дыстанцыі ад іх, ставіўся вельмі скептычна. Але са мной здараліся цуды, непадуладныя ніякім рацыянальным тлумачэнням, і я не мог іх абвяргаць. Напрыклад, адчуванне прысутнасці Хрыста — настолькі блізкае, што можна было нават задаць пытанне яму ці паспрачацца. Гэта як ва Уладзіміра Караткевіча. Ён пастаянна вяртаўся да тэмы Царквы і Бога, хацеў з ім дужацца, хацеў быць, як Ізраіль. Ласку такога змагання мае кожны. Гэта таксама частка творчасці, частка жыцця чалавека. Па мне, вернік — гэта той, хто шмат у чым змагаецца з Богам. А Бог яго за гэта яшчэ больш падтрымлівае. Ёсць нават такі абраз, дзе Якаў дужаецца з Богам. Адной рукой ён барукаецца з ім, а другой — падтрымлівае, дае моц на творчую барацьбу, на скепсіс. У гэтым плане чалавек, які не веруе, абдзелены радасцю змагання. Бо з кім яшчэ ваявацца?

***— Ёсць такая тэорыя, што дзеці, народжаныя ад бацькоў розных народаў, нават блізкіх па сваёй Сутнасці, больш энергічныя, здольныя да жыцця і поспеху, чым тыя, што ад адной нацыі. Ці так гэта?***

— У мяне няма на гэты конт адназначнага погляду. Кажуць, што самыя прыгожыя дзяўчаты жывуць па берагах рэк. Бо па іх плывуць падарожнікі, спыняюцца, паміж імі адбываюцца сустрэчы, і ў выніку нараджаюцца досыць добрыя дзеткі, бо змешваецца кроў. Я не стаў бы спрачацца з тым, што ў чалавека ёсць генетычная спадчына. Але ўсё ж такі, на маю думку, не варта чалавека абмяжоўваць выключна яго паходжаннем. Кожны сам адказвае за ўласнае шчасце і ў пэўнай ступені лёс.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА і з сямейнага архіва героя.**



На пачатку інтэрв'ю мы папрасілі Андруся намаляваць уласную асацыяцыю са словам «сям'я». Мастак ахвотна дастаў з заплечніка альбом і алоўкі, якія заўсёды носіць з сабой, і прыняўся за любімую справу. Вось што з гэтага атрымалася.

■ Справа жыцця

# Мамы-чэмпіёнкі

## Як яны сумяшчаюць кар'еру і галоўнае прызначэнне жанчыны

**Самай папулярнай спартыўнай персонай мінулага тыдня стала Дар'я Домрачава, і справа тут зусім не ў яе атлетычных подзвігах. Наша чэмпіёнка і тытулаваны нарвежскі біятланіст Уле-Эйнар Б'ёрндален нарэшце абвясцілі аб сваіх адносінах. Больш за тое, стала вядома, што ў «зорнай» пары хутка з'явіцца дзіця, такім чынам, тандэм Дар'і і Уле-Эйнера ператворыцца ў сапраўдную сям'ю. Сярод заўзятараў і журналістаў паўсталі асцярогі, маўляў, «мы страцілі чэмпіёнку», аднак Даша паспяшалася ўсіх абнадзеіць: яна плануе вярнуцца ў вялікі спорт ужо ў студзені 2017 года. Пакуль грамадскасць разважае пра тое, якой краіне будзе прыносіць медалі спадчыннік спартыўных бацькоў, мы раскажам пра некаторых беларускіх матуль-чэмпіёнак і пра іх стаўленне да сваіх галоўных жыццёвых узнагарод — дзетак.**

**На самых буйных спартыўных арэнах планеты гэтыя дзяўчаты паказваюць найлепшыя секунды, хвіліны, метры, атрымліваюць найвышэйшыя балы. На іх выступленні глядзяць мільёны людзей, яшчэ столькі ж захапляюцца іх сілай, уменнем і здольнасцямі. Яны атрымліваюць кубкі, медалі і добрыя прызавыя, але іх галоўнае шчасце заключаецца не ў гэтым. Акрамя гордага звання чэмпіёнкі, кожная з іх мама — чалавек, які даў новае жыццё.**

***Ала ЦУПЕР,***
***алімпійская чэмпіёнка па фрыстайле:***

### «Мы з мужам вельмі хацелі другое дзіця»



Гэтая дзяўчына прыехала да нас з Украіны, і можна сказаць, што менавіта з яе пачаўся жаночы фрыстайл у Беларусі. Алімпіяду Ала называла самым нязгодлым для сябе турнірам, вялікая адказнасць, хваляванне і, як вынік, правальныя выступленні. Але ўсё змянілася ў 2014-м, калі беларуская спартсменка на сваіх пятых Алімпійскіх гульнях заваявала чэмпіёнскі тытул.

Хто паверыць, але за два гады да таго Ала пакінула спорт, нарадзіла дачку, акунулася ў сямейнае жыццё, побыт і ўжо не збіралася вяртацца на снежны схіл. Яна занадта шмат аддала спорту і цяпер увесь свой час хацела прысвяціць любаму мужу Яўгену і дачцэ Лізавеце. Як прызнаецца пазней галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Мікалай Казека: «Мы ўсе ўсё роўна чакалі Алу ў камандзе». Мабыць, гэта ведаў і яе муж, менавіта ён папрасіў жонку вярнуцца ў спорт.

*«Калі мы толькі пазнаёміліся, Яўген хацеў, каб я развіталася з фрыстайлам, бо, як і любая спартсменка, я ўвесь час была ў раз'ездах: зборы, трэніроўкі, спаборніцтвы. Калі дачцэ было 8 месяцаў, ён сказаў мне: «Можа паспрабуеш яшчэ раз? Ты ж так даўно хацела заваяваць алімпійскі медаль». Я падумала, чаму б і не вярнуцца, калі ёсць такі шанц?»*

Ала прыступіла да трэніровак, фізіялагічныя якасці яе арганізма хутка дазволілі вярнуць былую форму, але апроч мары пра алімпійскае «золата» ў яе сэрцы было яшчэ адно жаданне — *«Мы з мужам вельмі хацелі другое дзіця»*.

У 34 гады яна прынесла Беларусі перамогу на Алімпіядзе, выканаўшы не толькі сваю мару, але і соцень айчынных заўзятараў. А праз паўгода пасля гучнай перамогі даведалася пра іншае дзіва — Цупер чакала другое дзіця.

*«Самае складанае, чым давялося ахвяраваць, — гэта расстанне з дачкой перад Алімпійскімі гульнямі. У лістападзе нам з мужам прыйшлося адвезці яе да маёй сястры і бацькоў, а ўбачыліся мы толькі пасля Алімпіяды ў лютым»,* — успамінае Ала.

Цяпер шчаслівая мама дваіх дзяцей цалкам займаецца сям'ёй, усё радзей Алу можна ўбачыць на спартыўных спаборніцтвах, але самыя адданыя заўзятары яе таленту песцяць мару ўбачыць Цупер у паветры.

***Марына АРЗАМАСАВА,***
***чэмпіёнка свету і Еўропы ў бегу на 800 метраў:***

### «Дачка прымушае мяне бегчы яшчэ хутчэй»




Сама Марына нарадзілася ў спартыўнай сям'і. Яе мама Равіля Аглетдзінава таксама займалася лёгкай атлетыкай і не раз выйгравала буйныя сусветныя турніры, тата спецыялізаваўся на скачках у вышыню. Дарэчы, па ўспамінах трэнера Равілі, маленькая Марына зрабіла свае першыя крокі менавіта на стадыёне, мабыць, тады і вырашылася яе будучыня. Муж Арзамасавай таксама былы спартсмен, у іх сям'і расце маленькі цуд — Аляксандра. Ці працягне дачка сямейныя традыцыі?

*«Усё будзе залежаць толькі ад яе жадання, вядома, талент таксама адыгрывае вялікую ролю, але асноўнае — гэта працавітасць і ўласнае жаданне чалавека. На дадзены момант Сашка вельмі актыўная дзяўчынка, у яе добра атрымліваецца бегаць пад каманду «на старт, увага, марш!»* — адзначае мама Марына.

Каму-каму, а Арзамасавай нараджэнне дзіцяці дакладна пайшло на карысць. Пасля з'яўлення «навагодняга цуду», а менавіта так называюць Сашу бацькі (дзяўчынка нарадзілася 29 снежня), спартыўныя вынікі Марыны пайшлі ўгару — яна стала спачатку чэмпіёнкай Еўропы, а затым і лепшай у свеце. Можа, яе сакрэт поспеху заключаецца менавіта ў сям'і? Бо, па прызнанні самой спартсменкі, перад чэмпіянатам Еўропы муж спецыяльна браў адпачынак. Каб дапамагчы жонцы падысці да спаборніцтваў у аптымальнай форме, ён стаў яе напарнікам і штодзень пераадольваў дыстанцыю разам з Марынай. Ну, а дачка Аляксандра з нецярпеннем чакала маміных медалёў дома, дарэчы, менавіта дачку спартсменка называе галоўным стымулам для росту.

*«Яна прымушае мяне бегчы яшчэ хутчэй. На адным з чэмпіянатаў Еўропы ў памяшканнях я заняла 3-е месца,* — распавядае Марына Арзамасава. — *І гэтым вельмі засмуціла Сашу, яна ледзь не плакала, дома яе супакойвалі, казалі, што трэцяе месца — гэта таксама добра, за яго таксама даюць медалі, але дачка заўсёды кажа: «Я хачу, каб мама займала толькі першыя месцы і прывозіла дадому кубкі».*

У гэтым годзе ўсе беларусы разам з маленькай Сашай чакаюць чарговай перамогі мамы Марыны.

***Наталля ЦЫЛІНСКАЯ,***
***васьміразовая чэмпіёнка свету,***
***бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў,***
***шматразовая пераможца этапаў Кубка свету па веласпорце:***

### «Я ганаруся сваёй чацвёркай»

Хто знаёмы з Наталляй, ведае — яна батарэйка, здаецца, яе энергіі хопіць, каб падзарадзіць увесь свет. Неяк спартсменка сказала: *«Спачатку з мяне зрабілі машыну для вытворчасці медалёў, а потым для вытворчасці дзяцей»*. Наташа прыкла браць ад жыцця максімум, у спорце ёй не хапіла толькі залатой алімпійскай узнагароды, але здаецца, Цылінская спаўна вырашыла рэалізавацца ў іншым прызначэнні — мацярынстве. Сёння Наталля сапраўдная шматдзетная мама, як сказалі б у веласпорце, «у яе актыве» тры дачкі і сын Мішка.

У гады спартыўнай кар'еры Наташа нарадзіла Машу. Малая ніяк не паўплывала на вынік мамы-чэмпіёнкі. Веласіпедыстка хутка пасля родаў прыступіла да трэніровак і пасля з'яўлення першага цуду ў сваім жыцці заваявала яшчэ не адзін тытул.

*«Як цяпер памятаю: я на станку трэніруюся, а Маша ўсю трэніроўку моўчкі побач сядзіць на зэдліку. Не ведаю, як ёй гэта ўдавалася! Пацялёпае ножкамі — ды і засне»,* — успамінае Наталля сваё першае мацярынства.

Праз гады мама Цылінская прызнаецца, што ўсё ж першай дачцэ яе ўвагі было мала, таму і вырашыла «завязаць» з веласіпедам і цалкам займацца сям'ёй.

*«Медалі медалямі, але трэба вяртацца да вытокаў, дзе асноўнае прызначэнне жанчыны — гэта мацярынства»,* — разважае Наташа.

Цяпер у яе сям'і чацвёра дзяцей, з усімі яна спраўляецца на ўра, а калі гэта не атрымліваецца, на дапамогу прыходзіць не толькі муж, але і ўжо дарослая старэйшая дачка.

*«Я заўсёды хацела шмат дзяцей, таму што сама расла адна і гэта было жудасна сумна. Яны цяпер у мяне сварацца, мірацца, цалуюцца, і гэта сапраўднае шчасце, паўнавартасная сям'я. Я ганаруся сваёй чацвёркай»,* — кажа Цылінская.



Цяпер акрамя сваіх дзяцей Наталля займаецца і чужымі, яна вярнулася ў спорт у ролі трэнера і, хто ведае, магчыма, сёння тытулаваная спартсменка гадуе новых чэмпіёнаў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*
**Фота з архіва герань**

■ Нататкі таткі



## МАЛЕНЬКІЯ ДЗЕТКІ — МАЛЕНЬКІЯ БЕДКІ

**Кажуць, што толькі чужыя дзеці растуць хутка. На мой погляд, гэта не зусім так: свае растуць яшчэ шпарчэй. Ды так, што ты не заўсёды нават паспяваеш своечасова прыкмячаць усе перамены.**

З улікам таго, як наша Васіліса цягнецца да аднагодкаў, мы з жонкай вырашылі не адкладваць рашэнне пытання з дзіцячым садам да трох гадоў. Ды і па жонцы было відаць, як яна марудзіцца без працы. Таму, як толькі Васілісе споўнілася два гады, мы, канчаткова ўзважыўшы ўсе «за» і «супраць», пачалі афармляць неабходныя паперы.

Падрыхтоўка дачкі да дзіцячага сада пачалася задоўга да валтузні з паперамі. Жонка адмыслова загадзя сфарміравала для яе максімальна падобны распарадак дня. Падчас прагулак мы нярэдка бавілі час каля садаўскіх пляцовак і акцэнтавалі ўвагу Васілісы на тым, як там весела дзецям. Рыхтавалі малую, але чамусьці зусім забыліся настроіць на адпаведны лад сябе.

І вось накіраванне на руках, заўтра — першы раз у дзіцячы сад. Прызнаюся, што з вечара пачало прабіраць хваляванне. Дачка чамусьці ўжо не падавалася такой дарослай, як раней. Хацелася часцей яе абняць, каб даць крыху сваёй пяшчоты і пра запас. Раніцай, калі збіраліся: бясконца паўтаралі дачцэ, як ёй будзе добра ў дзіцячым садзе. Падбадзёрвалі і разумелі, што больш намагаемся супакоіць сябе, бо малая асабліва і не хвалявалася. Неспакойна было нам, бацькам. Сэрца шчаміла ад таго, як нават на адну гадзіну пакінуць яе з незнаёмым чалавекам: раптам яна будзе баяцца ці саромецца і не зможа патлумачыць, што ёй патрэбна... Гэтыя думкі не давалі спакою. І чым бліжэй падыходзілі да ганка, тым больш сумненняў наконт свайго рашэння ўзнікала. Ніякавата рабілася і ад таго, як хутка праляцеў час. Толькі-толькі гэты цуд з'явіўся на свет, мы абачліва станавіліся ў чаргу на месца ў садзе на далёкі 2016 год, і вось гэты дзень ужо прыйшоў...

Усе нашы хваляванні развеяла Васіліса. Толькі пераапранулі, яна сама пабегла ў групу. Нават не азірнулася, не сказала «пакуль». Мы ажно разгубіліся. Імгненне пастаялі і таксама пайшлі. Літаральна праз хвіліну, калі праходзілі міма акон, краем вока заўважылі, што яна ўжо катаецца з горкі. Ёй было добра, спакойна стала і нам.

Калі ўвечары прыйшлі забіраць дачку, яна, насуперак чаканням, не імчала насустрач, хутчэй наадварот — была засмучана, што неабходна сыходзіць. Так было першы, другі, трэці дзень. На чацвёрты — Васіліса ўжо шукала бацькоў, на пяты — раніцай ледзь стрымала слёзы і плакала ад шчасця, калі яе забіралі, моцна абдымала і гаварыла, што сумавала. Гэта, безумоўна, вельмі хвалявала нас, але мы стрымліваліся, супакойвалі малую і тлумачылі ёй, навошта хадзіць у сад.

Варта адзначыць, што дачка вельмі мужна пераносіць усе выпрабаванні, звязаныя з дзіцячым садам. Яна амаль не капрызнічала, калі праходзілі медыцынскую камісію. Пачала прачынацца раней, чым звычайна. А яшчэ Васіліса перасіліла сябе і пачала даваць заплятаць валасы. Калі раней хвосцікі і коскі на яе галаве «жылі» літаральна 1-2 хвіліны, то цяпер яна цярпліва носіць іх роўна да той хвіліны пакуль не прыйдуць бацькі. І толькі зачыняюцца дзверы ў групу, яна ў першую чаргу здымае ўсе заколкі і гумкі.

Нашы дзеці растуць вельмі хутка. Дзіцячы сад, школа, універсітэт, шлюб — прыступка за прыступкай яны смела ідуць наперад, а побач — мы, бацькі, якія абавязкова хвалююцца за кожны крок і, час ад часу, прыгадваюць, як усё было бесклапотна, калі карапузы ляжалі ў калысках.

**Аляксандр АЛЕСІК**

## Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:**
**17 мая 2016 г. в 11.00 состоятся открытые аукционные торги (торги) по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Бобруйсктранс» (продавец), в составе:**
**Лот № 1 (предмет торгов): Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-12887 (КПП платной стоянки) общ. пл. 19,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Минская, 123**

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369 |
| **Продавец предмета торгов** | Открытое акционерное общество «Бобруйсктранс», УНП 700169542, ОКПО 291215757, 213830, г. Бобруйск, ул. Минская, 123/1, р/с 3012420021026 в ОАО «Белинвестбанк» ЦБУ№ 831 г. Бобруйск ул. Пушкина, 198, код 739 р/с 3012259270013 в РКЦ № 24 ОАО «Белагропромбанк» г. Бобруйск, ул. Горького, 1, код 458 |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | ул. Чонгарская, д. 54, г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |
| **Начальная цена продажи и размер задатка** | 31 700 000 рублей без учета НДС, задаток 10% от начальной цены – 3 170 000 рублей |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа –** Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369, УНП 102353509 |
| **Информация о земельном участке** | Объект торгов расположен на земельном участке с кадастровым номером 741000000005001187 пл. 5,3080 га по адресу: г. Бобруйск, ул. Минская, 123. Имущественные права на земельный участок – право аренды. Земельный участок для обслуживания предмета торгов будет выделен после приобретения объекта с торгов согласно Законодательству Республики Беларусь |
| **Характеристика предмета торгов** | Здание КПП платной стоянки – двухэтажное кирпичное, фундамент – бетон., перекрытия – ж/бет.; кровля – рулонная, полы – бетонные, дощатые, имеется печное отопление и электроснабжение |
| **Условия продажи предмета торгов** | 1. При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20%, который необходимо перечислить на р/с ГУ МФ Республики Беларусь по Могилевской области № 3602917010008 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 795, УНП 700005949, назначение платежа 01001 за ОАО «Бобруйсктранс», УНП 700169542<br>2. Здание реализуется под контролем судебного исполнителя<br>3. Денежные средства, причитающиеся от реализации объектов без учета НДС, перечисляются на счет ОАО «Бобруйсктранс» № 3012259270039 в РКЦ № 24 ОАО «Белагропромбанк» г. Бобруйск, ул. Горького, 1, код 458, УНП 700169542 |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (Двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов |
| **Сроки и условия оплаты** | Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | **по 12 мая 2016 г. включительно до 17.00** |

**Для участия в торгах лица, заявившие о своем участии в них, должны предоставить по указанному адресу следующие документы:** заявление на участие в торгах; копию платежного поручения о внесении участником торгов суммы задатка с отметкой банка об исполнении, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в торгах) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорус. (рус.) язык; **представителям юр. лиц и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Порядок проведения торгов: Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.** Задаток, внесенный Победителем торгов, будет зачтен в счет оплаты стоимости услуг Организатора торгов, разница между задатком и суммой стоимости услуг будет зачислена в счет окончательной оплаты приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до даты их проведения

**Победитель (Претендент на покупку)** возмещает затраты и стоимость услуг на организацию и проведение торгов не позднее 3 (трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в размере 20% от начальной цены продажи

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30**

Утерянные печать и свидетельство о государственной регистрации ООО «Студио Модерна» с регистрационным номером 691454544 **считать недействительными.**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## по объекту «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова» Жилой дом № 14 по генплану».

**Сведения о застройщике.**

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад», зарегистрированное Мингорисполкомом 05.01.2015 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №192400611.

Юридический адрес: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, д. 4-107, тел./факс 234-16-99, тел. 234-16-98. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты: жилые дома №№ 6, 8, 10, 14 по ул. Каролинской; жилой дом № 4 по ул. С. Есенина; жилой дом № 14а по ул. Короля; жилые дома №№ 12, 16, 22 по ул. Чюрлёниса; жилой дом № 6 по ул. С. Есенина.

Цель проекта – строительство объекта «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова.» Жилой дом № 14 по генплану».

Начало строительства объекта – апрель 2016.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию – январь 2017.

Государственная экспертиза проектной и сметной документации: заключение ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» от 26.01.2016 № 1080-60/15.

Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельного участка от 03.02.2016 № 500/1571-2931.

Разрешение Госстройнадзора на производство строительно-монтажных работ – от 01.04.2016 № 2-203Ж-011/16.

Генеральный подрядчик – ОАО «Минский домостроительный комбинат» (договор строительного подряда № 2-2016 от 01.04.2016).

Жилой дом запроектирован 16-этажным, односекционным в конструкциях серии ОКПМ крупноблочных жилых домов, с техническим подпольем, теплым чердаком. Всего квартир – 126, в том числе: 1-комнатных – 63, 2-комнатных – 31, 3-комнатных – 31, 4-комнатных – 1. Общая площадь квартир – 7997,75 кв.м. На первом этаже располагается помещение товарищества собственников площадью 80,72 кв.м.

Отделка наружных стен – фасадные краски, покрытие защитно-декоративным полимерным составом. Окна, балконные дверные блоки, остекление лоджий – ПВХ-профиль. Наружные входные двери – металлические. Предусмотрены два лифта грузоподъемностью 400 и 630 кг, мусоропровод, поквартирный учет холодной и горячей воды, электроэнергии и тепла, устройство внутриквартирного пожаротушения. Квартиры оборудованы автономными пожарными извещателями.

Проектом предусмотрена внутренняя отделка помещений типовых потребительских качеств.

В состав общего имущества объекта входят лестницы, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, кровля, технические и подвальные этажи, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых помещений.

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 7,3% общей площади жилых помещений дома.

**Согласно решению Мингорисполкома от 22.01.2016 № 118 строительство жилых помещений будет осуществлено с привлечением граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по направлениям администраций районов г.Минска в порядке постановки на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий.**

**Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 115 (сто пятнадцать) квартир, в том числе:**

- 63 (шестьдесят три) 1-комнатных общей площадью от 48,97 до 49,35 кв.м;
- 20 (двадцать) 2-комнатных общей площадью от 64,48 до 64,7 кв.м;
- 31 (тридцать одна) 3-комнатная общей площадью от 89,69 до 89,97 кв.м;
- 1 (одна) 4-комнатная общей площадью 113,27 кв.м.

Стоимость 1 кв.м общей площади объекта долевого строительства на день опубликования проектной декларации в текущих ценах с учетом прогнозных индексов – **12 816 913 рублей**.

**Условия оплаты –** первоначальный взнос в размере 30% стоимости объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – ежемесячно до конца строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор,
- направление администрации района г. Минска на долевое строительство,
- справка о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Документы для заключения договоров будут приниматься **с 20.04.2016 по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, д. 4, офис 107, каб. 1, тел.: (017) 234-16-98, (044)795-44-44.**

# ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту «Многоэтажный жилой дом со встроенными объектами торгово-общественного назначения и многоуровневой гараж-стоянкой №3 по генплану по пр. Дзержинского в границах пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожной – пер. Разинского – пер. 1-го Извозного» (2 очередь строительства),**
опубликованную в газете «Звязда» 14.04.2015 г. следующего содержания:

«**Застройщик**: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, каб. 12. **Тел. 8 (017) 216 00 09.**

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц:**

**1-комнатные квартиры 47 м², 2-комнтаные квартиры 47–51 м² –** при 80–100% оплате стоимость 1 м² **1 120** долларов США;

**2-комнатные квартиры 65 м²** при 80–100% оплате стоимость 1 м² **1000** долларов США;

**3-комнатные квартиры 67 м², 71 м²** – при 80–100% оплате стоимость 1 м² **1 030** долларов США;

**4-комнатные квартиры 85 м²** – при 80–100% оплате стоимость 1 м² **1 000** долларов США.

Стоимость неизменна до окончания строительства.

**Ознакомление дольщиков с планировками квартир**, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ОДО «Айрон» по адресу: г. Минск, переулок Червякова, д. 21А, кабинет 12. **Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029)654 10 10, 8 (029)708 46 64. Официальный сайт www.airon.by.**

# ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Сосновая, д. Дуброва, д. Липники, д. Скураты, д. Лужки Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | 16 мая 2016 года в 11.00, а.г. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, а.г. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 – площадь 0,1500 га, № 624883010101000465, д. Сосновая (по гп № 2)<br>Лот № 2 – площадь 0,1500 га, № 624883003801000308, д. Дуброва ( по гп № 2)<br>Лот № 3 – площадь 0,1142 га, № 624883005101000240, д. Липники (по гп № 4)<br>Лот № 4 – площадь 0,1430 га, № 624883009101000204, д. Скураты (по гп № 1)<br>Лот № 5 – площадь 0,1500 га, № 624883005601000166, д. Лужки (по гп № 10) |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 – 250 000 000 рублей<br>Лот № 2 – 250 000 000 рублей<br>Лот № 3 – 200 000 000 рублей<br>Лот № 4 – 200 000 000 рублей<br>Лот № 5 – 200 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | а) продажа по цене не ниже начальной;<br>б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории страны или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | д. Сосновая – электричество<br>д. Дуброва – газ<br>д. Липники – газ<br>д. Скураты – нет<br>д. Лужки – нет |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12 | **Порядок предв. ознаком. в натуре с земельными участками** | Среда в 10.00 |
| 13 | **Прием документов** | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 13 | **Окончательный срок приема документов** | 6 мая 2016 года в 17.00 |
| 14. | **Контактные телефоны** | 8 01776 44 636, 68 030 |

Расходы по организации и проведению аукциона (лот № 1 – 14 834 954 белорусских рубля, лот № 2 – 14 933 639 белорусских рублей, лот № 3 – 13 651 388 белорусских рублей, лот № 4 – 15 049 500 белорусских рублей, лот № 5 – 8 958 768 белорусских рублей) ко всем лотам плюс стоимость затрат на публикацию информационного сообщения (объявления) в газете подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.

# ЗАО «АГРЭСТ» ИНФОРМИРУЕТ АКЦИОНЕРОВ

**о проведении внеочередного собрания акционеров 26 апреля 2016 г. в 11.00 по адресу г. Минск ул. Филимонова, 2.**

**Повестка дня:**

**1.** Отчет ревизионной комиссии ЗАО «Агрэст» по итогам работы за 2015 г. и выборы ревизионной комиссии ЗАО «Агрэст» на 2016 г. **2.** Утверждение работы ЗАО «Агрэст» за 2015 г. **3.** Распределение дивидендов между акционерами ЗАО «Агрэст» по итогам работы за 2015 г. **4.** Распределение дивидендов между акционерами ЗАО «Агрэст» по итогам работы за 1 квартал 2016 г. УНН 100266857

# ИЗВЕЩЕНИЕ об открытом аукционе по продаже земельных участков гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Кобринском районе Брестской области 19 мая 2016 года в 11.00

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | д. Патрики, ул. Каштановая, 5 Хидринский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124385506601000376 | 0,1496 | - | 18 794 450 | 1 879 500 | 10 697 625* |
| 2. | д. Патрики, ул. Каштановая, 7 Хидринский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124385506601000377 | 0,1496 | - | 18 794 450 | 1 879 500 | 10 697 625* |
| 3. | г. Кобрин, ул. Аэродромная, 31 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100002004003 | 0,1300 | Возможность подключения газоснабжения, электроснабжения, водоснабжения | 177 202 250 | 17 720 300 | *расходы на публикацию извещения в СМИ* |
| 4. | г. Кобрин, ул. Мартынова, 11 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100002004346 | 0,1382 | Возможность подключения газоснабжения, электроснабжения, водоснабжения | 128 478 800 | 12 847 880 | *расходы на публикацию извещения в СМИ* |
| 5. | д. Борисово, ул. Прибрежная, 6 Киселевецкий сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124383001101000330 | 0,1484 | - | 29 939 580 | 2 994 000 | 12 377 055* |
| 6. | д. Борисово, ул. Прибрежная, 8 Киселевецкий сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124383001101000329 | 0,1463 | - | 29 515 906 | 2 951 600 | 10 872 396* |
| 7. | д. Полятичи, ул. Цветочная, 10 Батчинский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380403601000158 | 0,1600 | - | 20 000 000 | 2 000 000 | 8 403 139* |
| 8. | д. Полятичи, ул. Новая, 9 Батчинский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380403601000160 | 0,2264 | - | 28 000 000 | 2 800 000 | 8 926 196* |
| 9. | д. Большие Лепесы ул. Юбилейная, 1 Буховичский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380601601001027 | 0,1461 | - | 47 000 000 | 4 700 000 | 12 976 046* |
| 10. | д. Большие Лепесы ул. Рябиновая, 4 Буховичский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380601601001026 | 0,1500 | - | 47 000 000 | 4 700 000 | 12 958 432* |

** и расходы на публикацию извещения в СМИ*

**Организатор аукциона – Кобринский районный исполнительный комитет**.

**Аукцион состоится 19 мая 2016 года по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.**

Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: **г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**

Последний день приема заявлений – **13 мая 2016 г. до 13.00**. Тел. для справок: **8(01642) 2-28-11, 2-32-82.**

К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявление в соответствии с действующим законодательством. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь.

Более подробная информация об условия проведения аукциона размещена на сайте **www.brest-region.by**

# АЛЕЯ ПАД НІЦЫМІ ВЕРБАМІ

## У КОЖНАГА ЁСЦЬ МЕСЦА, КУДЫ ХОЧАЦЦА ВЯРНУЦЦА

**Назва гэтых нататак яшчэ за хвіліну да іх напісання меркавалася іншай: «Несезон». Вось так — адным словам, без мудрагельства. І варта зарэгістраваць яго ў слоўніках — як найменне для ўплывовейшай з'явы. «Несезон» — гэта калі ярка-ярка, да вясёлкавых дрыжыкаў успамінаюцца падарожжы, якіх не было. Хоць на такія ўспаміны таксама павінна знайсціся прычына...**

### Адкрывальнікам

*Спіс рэчаў, патрэбных у падарожжы на аўтамабілі пры ўмове начавання ў палатцы, складае два шчыльныя слупкі вышынёю ў старонку клятчастага сшытка. Мяркуеце, можна яго аднойчы скласці, а потым выкарыстоўваць як шматразовы? Ні ў якім разе. Кожны раз вам патрэбна нешта новае, а тое, што застаецца ў спісе нязменным, чамусьці ўкладаецца ў аўтамабіль і без спіса, пакуль той самотнай плямкай бялее пад магнітам з перадапошняга падарожжа. Але барані Бог вас не мець гэтай плямкі. Зборы ў падарожжа ўяўляюцца святам, якому сцэнарый і імправізацыя аднолькава неабходныя.*

*Хутчэй бы ўжо...*



**Святло, якое пранікала ў памяшканне млына-вінакурні раней, было не менш таямнічым: Сонца заўсёды глядзіць на Зямлю адным вокам і не міргаючы.**

ТОЕ, што ўбачыцца табе ўнутраным зрокам пры чытанні наступных радкоў, дарагі мой чытач, не палічы, калі ласка, за ўласную мрою. Бо калі гэта мроя, то яна мая. Але хутчэй не мроя, а ўспамін з далёкай-далёкай рэальнасці.

А там што толькі ні адбываецца! Там слімакі-вінаграднікі палахліва хаваюць тэлескапічныя шчупальцы пад жорсткія дахі-хацінкі пры кожнай нязначнай нагодзе і ахвотна паказваюць зноў, папрасі толькі: «Слімак-слімак, пакажы рожкі». Там легендарна-небяспечныя «чортавы вароты» чарнеюць графітава-змрочнай здагадкай: хто праз іх пройдзе на шляху ў школку, той атрымае «двойку». Там над старым сядзібным паркам лётаюць, гарлапанячы на ўвесь свет, звячэлыя крумкачы — прывіды сівых дзён і даўніх міфаў. Там па алеі пад ніцымі вербамі паўзе па справах калматы вусень, які стане пасля матылёчкам — мядзведзіцай кайя. А пры дарозе, абсаджанай бярозкамі і «кашкай», пад ногі трапляюцца сыраежкі...

ПАМІЖ падарожжамі па памяці і ў памяці істотнай розніцы быццам няма. Вы бераце ўспаміны — і вандруеце з імі, седзячы на канапе. Проста ў адным выпадку вы трымаеце ў руках свае фотаздымкі з ранейшых вандровак, а ў другім — «Звязду» з «Падарожнікам» і гэтымі маімі ўспамінамі, якія перанясуць вас, спадарства, у вёску Бабоўня, што на Капыльшчыне.

Я некалі хадзіла яе сцежкамі і вулкамі ў трэці клас пачатковай школкі — маленькай, драўлянай, з печкай пасярод класа, настаўніцай Марыяй Пятроўнай і штодзённым вядром гарачай гарбаты, якая разлівалася пасля трэцяга ўрока ў шклянкі і падавалася на кожную парту з цукровым печывам, смак якога не перадаць.

Шлях у школку і назад быў прыгодніцкім, ніяк не менш. Бо згаданым слімакам карцела трапіць у нашы рукі і надоўга ў іх затрымацца. Бо чорныя слупы літарай Л, «чортавы вароты», трэба было абыходзіць вялікім радыусам. Да таго ж за слупамі стаяў сасняк, які ўяўляўся дрымучым лесам з хаткай на курыных лапках недзе ў глыбіні сваёй дрымучасці.

Тое, што мы два разы на дзень перасякалі самую сапраўдную старую брукаванку, нас не ўражвала. Нам да яе веку не было ніякай справы. А тое, што яна павінна памятаць вясёлыя кірмашы і што ад яе каменьчыкаў адляталі некалі рэхам гукі касцельных службаў, не было нам вядома ўвогуле. Прахозячы паўз саўгасны млын, мы нават не здагадваліся, што гэта не млын, а вінакурня пані Яніны Траскуляцкай, амаль стогадовая. А гуляючы па алеях старога-старога парку, ледзь не трацячы прытомнасць ад навакольнага хараства мы не ведалі, што топчам нагамі сядзібу Наркевічаў-Ёдкаў. Памятаю, праўда, нейкія цьмяныя згадкі старых людзей пра ўнікальнага доктара, які ратаваў ад хваробаў вачэй. А яшчэ памятаю, як ужо ў пятым класе ў Лясноўскай школе (за сем кіламетраў адсюль) настаўнік рускай літаратуры распытваў нашага аднакласніка з прозвішчам Ёдка, адкуль яго бацька і дзед. Распытваў з нейкай асаблівай зацікаўленасцю і піетэтам. Тое, што Ёдка — прозвішча шляхетнае, і з намі вучыцца нашчадак старажытнага роду герба Ліс, мы таксама не ведалі. Ён і сам пра гэта не ведаў...

Урач-афтальмолаг Вітольд Наркевіч-Ёдка, выпускнік універсітэта ў Дэрпце, пасяліўся тут за сто гадоў да нас, у 1883-м. Гэта ён ператварыў Бабоўню ў той райскі куточак, рэшткамі якога і нам давялося прасякнуцца. Ён спрычыніўся, можна сказаць, да фарміравання светапогляду рамантычнай аматаркі краязнаўства, за стагоддзе да яе нараджэння пабудаваўшы сядзібны дом, пасадзіўшы сад, стварыўшы парк з утульнымі алеямі і маляўнічай воднай сістэмай, адкрыўшы амбулаторыю, дзе лячыў людзей бясплатна. Зарабляць яму было чым: у ваколіцах Бабоўні працавалі дзве цагельні. Кажуць, цэгла з лагатыпам «Bobovnia» выпускалася тут розных відаў, нават і чорная, самая моцная. Цяпер, калі пішу гэты радок, здаецца мне, што і пра гэта некалі ў Бабоўні нешта чула...

Калі сягаць глыбей, у часы ранейшыя, то гісторыя будзе такая: у XVIII стагоддзі тут была створана суконная мануфактура, сыравіна для якой у выглядзе авечак «гадавалася» на месцы, а фарбы дастаўляліся ці з Рыгі, ці з Кёнігсберга. Ці памятае спадарства пра суконную мануфактуру Антонія Тызенгаўза ў Гародні, фарбы для якой вырошчваліся ў тамтэйшым батанічным садзе, пасаджаным доктарам Жыліберам? Дык бабаўнянская «суконніца» была ёй аднагодкай! А касцёл, рэха якога памятае бабаўнянская брукаванка, быў драўляны, асвечаны ў імя Архангела Міхаіла і меў у бакавым алтары пасярэбраную статую святога Антонія Падуанскага...

КОЖНЫ чалавек на зямлі сваёй краіны мае нейкае месца, куды яму вельмі хочацца вярнуцца, хоць вярнуцца яму туды ніяк не магчыма. І тады, усвядоміўшы гэткі парадак не розумам, але сэрцам, ён выпраўляецца падарожнічаць — з надзеяй сустрэць жаданае ў чым заўгодна: у прахалодзе ранішніх шызых рос і гарачым асфальце пад босымі нагамі, у закінутых хатах і запыленых помніках, у стажку, прыхопленым посцілкай, у пераспелых суніцах, па якія шлях ляжыць цераз крапіву... У мацачках-сыраежках, што трапляюцца пад ногі, як каменьчыкі. У слімаку-вінаградніку ў рэшце рэшт. У калматым вусені, што паўзе і паўзе, быццам вечнасць яму не даецца ўзнакі, па алеі пад ніцымі вербамі.

**Падарожнічала Святлана ДЗЯНІСАВА.**



**Яшчэ колькі крокаў — і брукаванка.**

### Паслядоўнікам

*Журналістка і сцэнарыстка Вера Савіна ў нядаўнім сваім інтэрв'ю сказала пра нябесных паштальёнаў, якія дастаўляюць адрасатам нябесныя дары бесперабойна. І ў шляхецкія сядзібы дастаўляюць, і ў звычайныя вёскі, хоць часам і памыляюцца адрасамі. Прачытала я такія развагі — і задумалася: а чаму мы вечна так упэўнены, што сядзібам абавязкова трэба быць адноўленымі, і так лёгка спісваем выпадкі іх неаднаўлення на злачынствы супраць уласнай гісторыі? А раптам хто не заслугоўвае нябесных дароў? А раптам яны не дайшлі яшчэ, ды і толькі? І раптам нябесныя паштальёны — гэта, спадарства, мы, хоць пра тое не ведаем?..*

*«Несезон» нараджае шмат лішніх пытанняў. Час распачынаць вандроўкі наяве.*



**Вінакурня Пані Траскуляцкай.
Слімакоў-вінаграднікаў варта шукаць з адваротнага боку.**

### Рамантыкам

*Чым харошы «несезон»? Найперш, безумоўна, тым улагоджвальным фактам, што колькі месяцаў запар вас ніхто не кусае. Жудасныя ў сваёй неадчэпнасці членістаногія двухкрылыя істоты з агульным на ўсіх імем Culex pipiens маглі б даўно і назаўсёды знікнуць у пашчах дагістарычных рэптылій, але і ў эпоху хатніх яшчарак не зніклі. Вядома, знарок. Канешне, толькі для таго, каб было чым штогод выпрабоўваць дух сапраўдных падарожнікаў. Безумоўна, таму, што пакуль цягнецца «несезон», можна не толькі забыцца на іхнія ўкусы, але і засумаваць па іх.*

### ДАЛЁКА І БЛІЗКА

З 16 красавіка да 29 мая Масква чакае аматараў вясновай флоры ў «Аптэкарскім агародзе». Так называецца батанічны сад МДУ. Уваход у яго будзе адкрыты і з боку Грахольскага завулка, праз краму раслін і дэкору пад назвай «Plantarum».



**11 мая ў Барселоне пройдзе кірмаш мёду і розных зёлак у гонар Святога Понса. Апошні дагаджае і пчалярам, і траўнікам, і добрым гаспадыням, якія ў гэты ж дзень яшчэ і паспяваюць прыбрацца ў хаце, каб злыя сілы не прычапіліся. Калі выберацеся туды, то вам на Гаспітальную вулку, а там ужо знойдзеце.**

Інтэрактыўная выстава «Вар'яцкая лабараторыя» чакае аж да лета ў Домемузеі І з'езда РСДРП авантурыстаў любога ўзросту, але школьнікаў пускаюць толькі з дарослымі. Механіка, магнетызм, алхімія... Ёсць на што паглядзець і чым захапіцца.



**21 красавіка — дзень нараджэння Рыма. Вы памятаеце, што гэты горад быў заснаваны братамі, якіх выкарміла ваўчыца? Хоць гэтае веданне вам не спатрэбіцца. Што спатрэбіцца, дык гэта касцюм рымляніна, у якім можна будзе ўвайсці ў горад праз яго вароты і прыняць удзел у гістарычным шэсці.**

Міжнародны фэст камернай і харавой музыкі, як старадаўняй, так і сучаснай, праходзіць у красавіку і маі ў нашай славутай Сафіі. Выступаюць музыкі з Беларусі, Польшчы, Украіны, Расіі, Іспаніі і Германіі. Калі ваша душа прагне высокіх касмічных вібрацый, яскравых эмоцый і хараства, не раздумвайце ні хвіліны — вам у Полацк.



**З 29 красавіка да 1 мая — «Хавайся ў бульбу!» Чаму раптам, пасярод вясны? А проста так назвалі фэст байкераў, які пройдзе ў Гародні. Звычайным людзям без колаў на ім таксама будзе чым заняцца: атракцыёны, фаершоу, выступленне знакамітых гуртоў, шматлікія конкурсныя праграмы, а галоўнае — байкерскі дух, які перадаецца праз рык матораў і назіранне за барадатымі дзядзькамі ў чорных скуранках. Сапраўды, «Хавайся ў бульбу!»**

■ Фотаздымак з гісторыяй

# МАРЫЙКА-СМУГЛЯНКА

**Знаходзячыся ў чарговым адпачынку, вырашыў пабываць на сваёй малой радзіме, у вёсцы Камуна Любанскага раёна. І вось, пераадолеўшы амаль 500 кіламетраў, пад'язджаю да пасёлка Сосны. Звычайны пасёлак, якіх тысячы ў рэспубліцы. Але ён мне даражэй за любы горад свету! Таму што сюды хадзіла пешшу ў 9—10 класы Марыйка — маё першае школьнае каханне, мой вечны боль і незагойная рана.**



Праехаўшы пасёлак, паварочваю ў бок сваёй вёскі. Цяпер тут гравійка, а тады, у тыя далёкія гады, была звычайная пясчаная дарога. Уздоўж яе раслі велічэзныя прыгожыя бярозы. Некалькі дрэў захавалася і дагэтуль. Яны, вядома, памятаюць незвычайную смуглую дзяўчынку Марыйку, якая кожную раніцу ішла па гэтай дарозе ў школу, а ўвечары са сваімі неразлучнымі сяброўкамі Людай Мазур і Данілкінай Лідай вярталася дадому. Для нашага пакалення прайсці 15 кіламетраў нічога не значыла.

...Халодны лістапад 1967 года. Краіна адзначала юбілей — 50 гадоў Кастрычніку. Студэнтаў тэхнікума, хто далёка жыў ад Оршы, на свята адпусцілі дадому на пару дзён. Усю дарогу мяне мучыла толькі адна думка: як убачыць яе, маю ні з кім не параўнальную мілую смуглявую Марыйку. Бо заўтра рана раніцай трэба ехаць назад у Оршу, на заняткі.

Сышоў на скрыжаванні; узяўшы ў рукі чамадан, накіраваўся ў бок сваёй вёскі. Ужо пачынала цямнець, імжыў халодны восеньскі дождж. А апрануўся я зусім па-летняму (добра, што хоць здагадаўся абуць боты — на дарозе была непралазная гразь).

Перад святам я атрымаў ад каханай дзяўчыны доўгачаканы ліст і адразу адказаў ёй, паведаміў, што на 7 лістапада прыеду. Ці паспела атрымаць яна яго? Хутчэй за ўсё, што не...

Прайшоўшы сотню метраў, раптам наперадзе ўбачыў сілуэт з торбай у руцэ. Хада падалася да болю знаёмай. Так хадзіць магла толькі яна, мая мілая смуглянка. Пачуўшы мае крокі, дзяўчына азірнулася. Сарванае парывам ветру залатое лісце бярозы прыліпла да яе мокрых валасоў, утвараючы на галаве смуглянкі залатую карону. Марыйка здалася мне казачнай прынцэсай.

У лістах заўсёды лягчэй прызнацца ў пачуццях. А тут здарыўся поўны ступар. Голас прапаў, рукі анямелі...

— Міша, добры дзень! Што з табой, ты захварэў? Ужо мяне не пазнаеш ці не хочаш пазнаваць? — сказала чароўным голасам дзяўчына. — Давай свой чамадан, пойдзем сядзем пад бярозу, бо дождж ідзе... — Ты ліст мой атрымаў? Адказвай, ты што, нямы?

— Я, Маня, стаў нямы ад кахання да цябе, і ты гэта добра ведаеш.

— Ведаю, і даўно, яшчэ з трэцяга класа, — пасур'ёзнела дзяўчына. — Пара, Міша, ісці, а то мяне мама зачакалася, і мы можам прастудзіцца.

Марыйка накінула на мяне і сябе сваё паліто. І мы пайшлі па раскіслай дарозе. Але я на такія дробязі не звяртаў ніякай увагі. Наперадзе паказалася велізарная лужына. Абысці яе не было ніякай магчымасці. На шчасце, у мяне на нагах былі боты, затое ў Марыйкі — бардовыя туфлікі. Я падхапіў дзяўчыну на рукі і панёс праз тую лужыну. І адкуль толькі сілы ўзяліся, а галоўнае, смеласць, бо да гэтага мне ніколі не даводзілася насіць на руках дзяўчат...

Марыйка абхапіла мяне рукамі за шыю. Чамусьці яна маўчала. Затым ціха прамовіла:

— Міша, апускай мяне на зямлю. Лужына ўжо далёка ззаду... І навошта ты ехаў на адзін дзень з далёкай Оршы?

— Ты выдатна разумееш, навошта я сюды ехаў.

...Мы абаперліся на парэнчы моста, гледзячы на свінцовую ваду канала, якая адлюстроўвала яркія зоркі.

— Памятаеш, Міша, як ты год таму з нямецкага трафейнага бінокля ад той бярозкі за мостам падглядваў за мной, бо мой дом добра адсюль відаць. А потым назаўтра ў нашым класе ты прыкідваўся Вольфам Месінгам і, робячы разумны выгляд, адгадваў, што я рабіла ў сваім садзе. А нашы дзяўчаты вішчалі ад захаплення, не разумеючы, што да чаго.

— Але ці ведаеш, Марыйка, чаму я гэта ўсё рабіў? Хацеў увайсці да цябе ў давер, — сказаў я, апусціўшы галаву. — Каб ты хоць трохі заўважала мяне.

І тут я няўмела дакрануўся вуснамі да гарачай шчакі дзяўчыны.



Мае мілыя аднакласніцы. Злева направа: Бунас Марыйка, Кур'ян Ніна, Мазур Люда, Мазур Галя. Дзесьці 1965-1966 год.

— Ах ты мой жанішок, і калі ты ўжо навучышся цалавацца! — Марыйка абняла мяне, прыціснулася сваімі незвычайнымі вуснамі да маіх. Божа, якое гэта было шчасце! Гэта кароткае імгненне ў сваім жыцці я не прамяняў бы ні на якое багацце ў свеце! І тое ж самае я магу з упэўненасцю паўтарыць нават сёння, праз 48 гадоў.

...Заехаў я і на вясковыя могілкі. Паклаўшы кветкі на магілу бабулі, падыходжу да месца вечнага спачыну бацькоў Марыйкі — Ганны Міхайлаўны і Баляслава Іванавіча. Каб аддаць даніну павагі за тое, што яны выгадавалі і выхавалі такую цудоўную дачку. Ужо на выхадзе наведваю магілу аднакласніцы. Яе любілі і паважалі ўсе ў вёсцы — за дабрыню і выдатныя песні. Яна пайшла ў 15 гадоў. На сціплым помніку фота дзяўчынкі з сумнай усмешкай і кароткі, як яе жыццё, надпіс: «Рудзько Зоя, 1953—1968. Забыць нельга, вярнуць немагчыма».

**Міхаіл МАСКАЛЬЧУК,**
*г.п. В. Бераставіца, Бераставіцкі раён.*

**АД РЭДАКЦЫІ:** ***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

■ Мама, пачытай!

# ЗОРНЫЯ АРЭЛІ

Было ў красуні Вясны тры сыночкі. Тры жвавыя маленькія хлопчыкі: Сакавік, Красавік і Май.

І так яны сябравалі паміж сабою, што ніколі не расставаліся. І радавалі сваім іскрыстым смехам сонейка, рэчку і зямельку. Разам скакалі цераз ручайкі. Разам будавалі вясёлкавыя масткі і ўпрыгожвалі сады першымі кветкамі. Разам бегалі навыперадкі з ветрам. І гушкаліся на зорных арэлях. Матуля Вясна не магла нарадавацца на сыночкаў. Усюды разам.

Час ішоў, дзеці падрасталі і неяк непрыкметна ператварыліся ў дужых прыгожых юнакоў.

І трэба ж было здарыцца, каб усе трое закахаліся ў адну і тую ж Зорачку. Шмат іх з'яўлялася ноччу на небасхіле, ды гэта была самая яркая, самая прывабная. Таму і спадабалася ўсім тром. Вось і пачаліся паміж імі спаборніцтвы паміж сабою.

Першым вырашыў паказаць, на што ён здатны, Сакавік. Схапіў Лютага за каўнер ды і выкінуў за дзверы. Заскакалі сонечныя прамяньчыкі. Усё вышэй і вышэй над гарызонтам. Паступова прагрэлася паветра.

Даўжэйшымі сталі дні. Карацейшымі ночы. Пачалі абуджацца ад зімовага сну дрэвы. І карані дружна пацягнулі ваду з адталай глебы ў напрамку да пупышак. Весела зачырыкалі вераб'і. Як ні стараўся Люты, ды ўсё ж прыйшлося яму адступіць.

Другім за справу ўзяўся Красавік. Ён скінуў снег з дрэваў і з зямелькі. Паўсюль нейк асабліва мілагучна зажурчалі ручайкі. Потым на рэках і азёрах трэснуў лёд і пачаўся крыгаход. Рэкі сталі выходзіць з берагоў — разводдзе.



Дрэвы яшчэ голыя, але ўжо набухаюць пупышкі. Іх лускавінкі расхінаюцца і наверх паказваюцца кончыкі лісточкаў. Такія кволыя і празрыстыя, пакрытыя пушком.

Нарэшце не ўтрымаўся і Май. Ён вельмі імклівa, але з асаблівай пяшчотай ладзіў сваю справу. Ды так, што ўсё навокал, да чаго ён дакрануўся, умомант ажывала і расцвітала. Чаромха, вішня, яблыня. Сліва і груша. Бэз.

З зялёнай траўкі выглядвалі жоўценькія свавольнікі дзьмухаўцы. Незвычайныя прыгажосць і водар! Вярнуліся з выраю птушкі. Прачнуліся пчолкі, жучкі.

Раптам з неба на зямельку пасыпаўся цёплы майскі дожджык. Потым выглянула сонейка. І кропелькі заіскрыліся пад яго промнямі рознакаляровымі пацеркамі, утварыўшы вясёлку.

Сакавік, Красавік і Май, забыўшыся пра спрэчку, паімчалі па вясёлкавым мастку ў госці да Чэрвеня, каб перадаць эстафету Лету.

А Зорачка і дагэтуль дапамагае ўсім тром несці адказную вахту. Каб не збіліся з дарогі. Яна свеціць ім аднолькава пяшчотна. І нам з вамі таксама. Не заўважалі? А вы прыглядзьцеся добра калі-небудзь. І абавязкова ўбачыце яе, самую прыгожую і яркую, якая гушкаецца на зорных арэлях і ў сакавіку, і ў красавіку, і ў маі...

**Лёля БАГДАНОВІЧ,**
*г. Барысаў.*




# КРАСАВІК ДА НАС ПРЫЙШОЎ

**Загадкі ад удзельнікаў клуба «Ізяслаўцы» Заслаўскай гімназіі**

**Ад Улады Жукоўскай, 5 «Б» клас**

Дом-палац стаіць высокі,
Нашых ведаў там вытокі.
Радасць свеціцца наўкола.
Ну, вядома, гэта ...

*(школа)*

* * *

Палачка цудоўная,
Колерам няроўная.
Варта толькі ў рукі ўзяць —
Пачынае маляваць.

*(Аловак)*

* * *

У школьным ранцы я ляжу,
Як ты вучышся, скажу.

*(Дзённік)*

**Ад Кацярыны Валовіч, 6 «Б» клас**

Сакавік да нас прыйшоў,
І з пагоркаў снег сышоў.
Сталі марыць усе дзеці
Аб канікулах і ...

*(лета)*

## Пытанні для знаходлівых:

**Чалавек скочыў з самалёта без парашута. Ён прызямліўся на цвёрды грунт, але не атрымаў ніякіх пашкоджанняў. Чаму?** *(Самалёт стаяў на зямлі).*

Што знаходзіцца паміж пляжам і морам? *(Літара «і»)*

**Які гадзіннік паказвае дакладны час толькі два разы ў суткі?** *(Спыніўся).*

Чым чалавек можа дастаць да неба? *(Позіркам).*

**Друкуецца ў часопісе «Бярозка».**

*КАМУ ТРАПІЎСЯ ДОБРЫ ЗЯЦЬ, ТОЙ НАБЫЎ СЫНА, А КАМУ ДРЭННЫ — ТОЙ СТРАЦІЎ І ДАЧКУ (ДЭМАКРЫТ).*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

■ Водбліскі

# Толькі б у край мой вяла дарога...

## Міхася РУДКОЎСКАГА памятаюць на роднай Ганцаўшчыне, якую ён любіў усім сэрцам

**Ужо сталым прызнаным паэтам ён накрэсліць у сваім лірычным вершы адно з галоўных жаданняў душы: «Толькі б у край мой вяла дарога...» У гэты край ён прыходзіў і прыязджаў з усіх дарог, тут чэрпаў натхненне і сілы.**



**Сястра паэта Ірына Міхайлаўна РУДКОЎСКАЯ,** якая жыве ў Ганцавіцкім раёне, расказвае, што Міша пачаў вершы пісаць вельмі рана, у дзяцінстве. Нават, здаралася, чытаў свае першыя паэтычныя спробы вясковым сябрам, з якімі разам пасвілі жывёлу.

Калі брат паступіў вучыцца, Іра яшчэ не хадзіла ў школу, але яе ўспаміны пачынаюцца менавіта з гэтага перыяду: яна па-дзіцячы ўсведамляла свой гонар за разумнага, добрага, шчырага брата. І самым яркім водбліскам тых успамінаў, несумненна, застаецца гісторыя з сінімі чаравічкамі. Маці неяк была ў краме ў райцэнтры. А потым да слова сказала, што бачыла на паліцы сінія чаравічкі, якраз на сваю меншую. Потым уздыхнула на адвечную бядноту, у хаце капейкі лішняй не было, ды і забылася за бясконцымі справамі.

Малой жа тыя чаравічкі запалі ў душу:

— У вёсцы такіх не было ні ў кога — гаворыць Ірына Міхайлаўна. — Тады ў крамы прывозілі толькі чорнага колеру нават дзіцячы абутак, зусім рэдка, здаралася, карычневага. А каляровыя чаравікі — гэта з разраду нечага казачнага, невядомага. Вось я і падзялілася сваімі марамі-казкамі ў двары, а можа, гулялі з дзяўчынкамі ў прынцэс, вянцом убораў якіх маглі б быць тыя самыя сінія чаравічкі... Аднойчы мы бавілі час з дзецьмі на вуліцы, а суседскі хлопчык бяжыць і кліча мяне дадому, маўляў, брат прыехаў. З такой нагоды мы ўсёй кампаніяй пабеглі да нашай хаты: гэта ж падзея. А Міша стаіць і падае мне тыя самыя сінія чаравічкі (голас Ірыны Міхайлаўны дрыжыць, яна доўга спраўляецца з блізкімі слязьмі, потым працягвае), тыя пачуцці цяжка перадаць. Скажу толькі, што потым, калі ў жыцці бывалі цяжкія хвіліны, старалася ўспамінаць той выпадак, бо яшчэ ў студэнцкія гады прачытала ў аднаго псіхолага пра гаючую сілу падобных успамінаў. І праўда, вельмі часта дапамагала.

Ірына Міхайлаўна кажа, што вучылася ў брата і любові да слова, і густу, стылю, інтэлігентнасці. Сама помніць, як Уладзімір Калеснік называў яго шляхціцам. А Уладзімір Ягоўдзік неяк прывёў выказванне Івана Чыгрынава, які нібыта сказаў так: «Рудкоўскі застаецца інтэлігентным у любой сітуацыі, нават знаходзячыся пад мухай, у адрозненне ад большасці з нас». Тады людзі творчых прафесій часта хадзілі адзін да аднаго ў госці, сябравалі сем'ямі. Нярэдкімі гасцямі Міхася станавіліся калегі з Украіны, ён там бываў, рабіў пераклады з украінскай на беларускую.

Ірына Рудкоўская ведае на памяць мноства вершаў брата. Але з гадамі, прызнаецца, усё часцей звяртаецца да тых, што прысвечаны іхняй маці. На думку сястры, увесь яго тонкі лірызм, тое што Калеснік некалі назваў чуласцю сэрца, у Міхася Міхайлавіча менавіта ад мамы. Яна была надзвычай тонкай асобай. Вырасла сіратою, скончыла ўсяго чатыры класы, а на памяць чытала дзецям не толькі казкі, нават цэлыя ўрыўкі з паэм, вершы класікаў, пераказвала апавяданні. Яна імкнулася даць усім адукацыю, вывесці ў людзі. А ён, калі прыязджаў дадому, абавязкова цалаваў матчыну руку, што для вёскі той пары было ледзь не дзівам. Яшчэ маладым паэтам ён напісаў амаль філасофскі верш пра чатыры песні.

*«Прад тым, як упасці, навекі прапасці*
*Песні чатыры хацеў бы я скласці,*
*Найпершая песня — Маці...»*

І потым: «Чамусьці бацькоўская хата без маці — што грудзі жывыя без сэрца». Ужо сталым чалавекам, асэнсоўваючы жыццё, свет і сябе ў гэтым свеце, выдае як адкрыццё: «А хто мяне не падмане? Адная мама і сястра мо...»

Колькі разоў у цяжкую гадзіну кожны з нас прыходзіў да такой жа думкі, хоць бы ў самай глыбіні душы! Міхась Рудкоўскі пакінуў светлыя вершы, прысвечаныя маці, сёстрам, бацьку, дзеду-кавалю і, вядома, роднаму краю. Усё яго творчае жыццё з-пад пяра выходзілі радкі пра вёску, пра Ганцаўшчыну, Палессе. І вось у апошнім прыжыццёвым зборніку «Гарынь» чытаем як праграму, як запавет, як вынік многіх шляхоў і дарог:

*Мне не трэба нічога-нічога,*
*Толькі б ціха ў свеце было,*
*Толькі б у край мой вяла дарога,*
*Толькі б у небе трымала крыло.*
*Толькі б золата тое жывое*
*І высокі той бераг круты...*

У пятніцу, 15 красавіка, у Ганцавіцкім Доме культуры збяруцца аматары творчасці Міхася Рудкоўскага на вечарыну яго памяці з нагоды 80-й гадавіны з дня нараджэння паэта. Прыйдуць тыя, для каго ён пісаў свае вершы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Кінакрокі

# КЛАСІЦЫЗМ І МАДЭРН

## На складзе мэблі «Беларусьфільма» можна знайсці сапраўдныя рарытэты

**У дагонку распаведу пра рэквізіт нацыянальнай кінастудыі (у нумары за 2 красавіка) паведамляю: ужо пасля нашага наведвання пры разборы старых памяшканняў у адным замкнёным пакойчыку быў знойдзены залаты ключык з фільма «Прыгоды Бураціна» Леаніда Нячаева. Той самы. «У фільме ён выглядае большым», — сказалі мне па тэлефоне. На складзе ўжо не рэквізіту, а мэблі і іншых буйнагабарытных рэчаў мы ўбачылі яшчэ аднаго «ўдзельніка» гэтай карціны. Тут увогуле можна знайсці сапраўдныя рарытэты XIX і пачатку XX стагоддзяў, ваенныя трафеі і экзэмпляры, вартыя музеяў. Дарэчы, адзін каштоўны гарнітур з «калекцыі» кінастудыі быў адпраўлены ў Нясвіжскі замак.**



Мапед з дзіцячай карціны «Па сакрэце ўсім на свеце».

ЦЭХ падрыхтоўкі здымак уключае ў сябе шэсць складоў: апроч рэквізіту і мэблі, тут захоўваецца жаночае, мужчынскае і асобна ваеннае адзенне, абутак і галаўныя ўборы.

Пад словам «мэбля» трэба мець на ўвазе таксама рэчы хатняй гаспадаркі кшталту кошыкаў і кос (ад слова «касіць»), матацыклы, фальшывы іканастас і нават труну. Усяго каля пяцісот адзінак трымаецца ў двух вялікіх памяшканнях, дзе цяпер наводзіцца парадак: гэтыя рэчы толькі-толькі перавезены ў новы будынак. «Грузчыкі проста прынеслі і паставілі мэблю, — кажа загадчык складаў Аляксандр Трызна. — Нам спатрэбіцца шмат высілкаў, каб усё гэта акуратна рассартаваць». У сувязі з чым у супрацоўнікаў цэха нават з'явілася гульня пад назвай «Знайдзі пару для крэсла». З гэтым багаццем можна забаўляцца і іншым спосабам: паставіць гэтыя крэслы ў лінію такім чынам, каб прасачыць развіццё стыляў. Сучасны ўзор, казаць па праўдзе, будзе не самым выйгрышным.



Люстэрка з карціны «Рыжык у Залюстаркоўі» і трохсоткілаграмовы «монстр».

Але ўбачыць на складзе мэблі самае прывабнае нам нічога не замінала. Адну з цікавінак прыйшлося выкаціць, каб разгледзець бліжэй, — мапед з дзіцячай карціны «Па сакрэце ўсім на свеце» 1976 года. Ён быў зроблены спецыяльна для стужкі і да гэтых часоў захоўваецца на кінастудыі. Словамі Аляксандра, «у савецкія часы на «Беларусьфільме» працавала шмат умелых спецыялістаў», іх рукамі і быў створаны ўнікальны агрэгат, здольны ездзіць.

Змест склада мэблі вызначаюць такія ж акалічнасці, як і ў гісторыі пра склад рэквізіту. Усё, што набывалася і набываецца для карцін з дзяржаўным фінансаваннем, асядае на кінастудыі. Камерцыйныя праекты, што арэндуюць беларусьфільмаўскія пляцоўкі, разбіраюць антураж на свае патрэбы.

ЯШЧЭ ў савецкую эпоху, недзе да 1980-х, у часы неразвітага гандлю паміж адпаведнымі калекцыянерамі і аматарамі, у штаце кінастудыі працавалі спецыяльныя людзі, якія шукалі антыкварыят. Нехта старую бабуліну мэблю, замест таго, каб выкінуць, дарыў кінастудыі. Нешта прыцягвалася са сметнікаў. Дзякуючы такой практыцы ў актыве «Беларусьфільма» сабралася добрая музейная калекцыя.

Адна выцягнутая з трумо шуфляда нагадала пра пазычаныя ваенныя трафеі. На донцы — сапраўдная пячатка 1937 года з нацысцкай сімволікай і надпісам «Infanterie-Regiment. Rigersburg». Адкуль гэтая рэч з'явілася на кінастудыі — невядома, магчыма, з пэўнай дзяржаўнай установы. Ёсць версія, што пасля Другой сусветнай вайны ў якасці трафея яна была прывезена з Еўропы.

**На скрыні да фільма «Я — рускі салдат» бачыцца надпіс «Немцы жывыя». Значэнне невядомае.**

Падобная гісторыя звязана з самай пазнавальнай шафай «Беларусьфільма» — трохсоткілаграмовым «монстрам» сярэдзіны XIX стагоддзя ў стылі еўрапейскага класіцызму. Існуе легенда, што гэтая шафа адразу пасля заканчэння Другой сусветнай была прывезена з Германіі па асабістай просьбе нейкага савецкага генерала. У пэўны момант генерал трапіў у няміласць, а яго шафа — на «Беларусьфільм». Гэты трафей здымаўся ў фільмах «Масакра» Андрэя Кудзіненкі, «Прадмет абажання» Алега Базілава і іншых. Сёння яму патрабуецца рэстаўрацыя; частка шкляных уставак, калі прыгледзецца, некалі ўжо была заменена: арыгінальныя можна пазнаць па характэрных скошаных гранях — фацэтах.

Недалёка стаіць яшчэ адна сапраўдная антыкварная шафа, таксама ў стылі класіцызму, але ўжо другой паловы XIX стагоддзя — разьба, матывы калон і пілястраў, ільвіныя галовы. У камплект уваходзіць таксама буфет. Яшчэ адзін сведчыць пра мадэрн пачатку XX стагоддзя — гэтая рэч захавалася ў добрым стане: усе ручкі і завесы працуюць, на месцы арыгінальныя вітражы. Да стылю «мадэрн» адносіцца і люстэрка пачатку XX стагоддзя. «Такога вы нікалі нідзе не знойдзеце: вітраж, фацэт — усё сапраўднае», — кажа Аляксандр. Побач стаіць буфет, які яшчэ ў савецкія часы па-вандалісцку пафарбавалі ў «падлогавы» колер, замест таго каб пакрыць лакам.

Унікальнае крэсла з разьбой адлюстроўвае еўрапейскую моду канца XIX стагоддзя на кітайскі стыль. «Наўрад ці яно створана ў Кітаі, там такога не рабілі, — кажа Аляксандр. — У камплект да гэтага крэсла ідзе цалкам пакрыты разьбой куфар з ручкамі ў форме крылаў». Гэты куфар — тая выяўленая намі рэч, што здымалася ў нячаеўскіх «Прыгодах Бураціна».

СКЛАД мэблі кінастудыі можна раздзяляць на антыкварыят і бутафорыю, гэта значыць падробку. Прыкладам апошняга паслужыць шафа з шуфлядамі, якія не адкрываюцца, і дзвярыма, за якімі нічога няма. Гэта толькі бачнасць шафы, створаная недзе ў 1990-я гады. Больш раннія імітацыі, па словах Аляксандра Трызны, выглядаюць лепш, сустракаецца бутафорыя высокага класа, напрыклад «сярэднявечнае» крэсла, некалі створанае кінастудыйнымі мастакамі.

На складзе захоўваецца казачнае люстэрка, зробленае спецыяльна для фільма «Рыжык у Залюстаркоўі» Алены Туравай. Тут жа мы знайшлі іканастас з бутафорскай царквы. «Для пэўнай карціны трэба было правесці здымкі ў царкве, але не знайшлося ніводнай, куды пусцілі б кіношнікаў. Давялося мастакам-дэкаратарам, гэта было недзе ў пачатку 2000-х, пабудаваць «царкву» і стварыць гэты іканастас». Цікавым узорам бутафорыі з'яўляецца цэлы камплект славутых гучнагаварыцеляў, з якіх аб'яўлялі аб пачатку вайны, паветранай трывозе і так далей.

**Усё, што набывалася і набываецца для карцін з дзяржаўным фінансаваннем, асядае на кінастудыі. Камерцыйныя праекты, якія арандуюць беларусьфільмаўскія пляцоўкі, разбіраюць антураж на свае патрэбы.**

На «Беларусьфільме» можна знайсці прадметы савецкага антуражу, часам унікальныя рэчы — напрыклад, канапу з архітэктурным элементам, створаную ў 1930-х, і больш сучасную мэблю. «Рэчы з 1960-х гадоў — час савецкага постмадэрну, моду на капіраванне заходніх аналагаў — мала дзе можна сустрэць». Але з дапамогай базы кінастудыі, здаецца, можна адлюстраваць кожнае дзесяцігоддзе, праўда, апошнім часам склад амаль не абнаўляецца. Папулярная практыка арэнды рэальных кватэр для здымак фільмаў дапамагае сэканоміць, спрасціць задачу мастаку-пастаноўшчыку, але, зразумела, не папаўняе кінастудыйны склад.

Цікавым водгаласам ужо не гістарычнай эпохі, а менавіта кінаспраў з'яўляюцца скрыні для перавозкі рэквізіту і касцюмаў. Па надпісах часам можна прасачыць, куды вандравала скрыня і што ў ёй захоўвалася. На адной з іх, з абазначанай рабочай назвай карціны «Пяць прэзідэнтаў», ёсць дадатак: «Боты розныя камплект». На скрыні да фільма «Я — рускі салдат» бачыцца надпіс «Немцы жывыя». Значэнне невядомае.

**«Для пэўнай карціны трэба было правесці здымкі ў царкве, але не знайшлося ніводнай, куды пусцілі б кіношнікаў. Давялося мастакам-дэкаратарам пабудаваць «царкву» і стварыць іканастас».**

Нешта з наяўных у актыве цэха рэчаў, на жаль, пацярпела ад неадпаведнага захоўвання. Аляксандр амаль у розных кутах знайшоў элементы аднаго антыкварнага люстэрка, якое дзесяцігоддзямі чакае аднаўлення. Яшчэ не так даўно ў штаце кінастудыі была пасада рэстаўратара, але з-за фінансавых цяжкасцяў супрацоўнікаў перавялі на дагавор падраду, які ў выніку таксама не працягнулі.

ДЗЕЛЯ гумару загадчык склада зрабіў выстаўку страчаных дэталяў. «З ручкамі бяда, — кажа Аляксандр і як доказ паказвае савецкі «сур'ёзны» стол. — Ён папулярны для фільмаў пра злосных следчых КДБ, якія, седзячы за гэтым сталом, дапытваюць невінаватую ахвяру. З чатырох ручак на месцы толькі адна. Астатняя трэба знайсці».

Па-ранейшаму «Беларусьфільм» не адмаўляецца ад новых экзэмпляраў, таму сваю прагную да славы мэблю можна аддаць на карысць кінастудыі. «Толькі моль лепш выганяць загадзя», — жартуюць супрацоўнікі.

Магчыма, калі-небудзь будзе рэалізавана ідэя музея кінастудыйнага антыкварыяту. Дакладна, склады мэблі здолеюць папоўніць экспазіцыю. Пакуль у цэху падрыхтоўкі здымак адбываецца перавозка касцюмаў, мэблі, рэквізіту, сістэматызацыя, акліматызацыя. Па кроках, але памяшканні ў новым корпусе, пабудаваным падчас рэканструкцыі кінастудыі, набліжаюцца да абсалютнага парадку.

**Больш фотаздымкаў шукайце на сайце zviazda.by.**

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

**Организация: Открытое акционерное общество**

# «Белагроздравница»

Адрес: г. Минск, ул. Фабрициуса, 7-а. Учетный номер плательщика: 100119014.
Вид экономической деятельности: деятельность санаторно-курортных организаций с оказанием услуг медицинскими работниками (по ОКЭД 86103).
Руководитель: генеральный директор Аверченко Иван Федорович, действует на основании устава.
Организационно-правовая форма: Открытое акционерное общество
Единица измерения: млн руб.

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 550 909 | 517 819 |
| Нематериальные активы | 120 | 556 | 92 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 17 987 | 7 270 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 11 | 11 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 659 | 695 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 28 | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **570 150** | **525 887** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 22 779 | 21 935 |
| В том числе: | | | |
| материалы | 211 | 22 494 | 21 640 |
| готовая продукция и товары | 214 | 285 | 295 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 2 655 | 2 546 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 7 120 | 8 023 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 56 827 | 40 148 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 23 916 | 29 332 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 20 754 | 16 328 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **134 051** | **118 312** |
| **БАЛАНС** | **300** | **704 201** | **644 199** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 90 068 | 90 068 |
| Резервный капитал | 440 | 20 446 | 18 561 |
| Добавочный капитал | 450 | 368 401 | 344 790 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 92 322 | 75 049 |
| Целевое финансирование | 480 | 100 | 132 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **571 337** | **528 600** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 240 | 50 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 33 113 | 33 408 |
| В том числе: | | - | - |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 20 782 | 19 166 |
| по авансам полученным | 632 | 3 408 | 6 352 |
| по налогам и сборам | 633 | 1 399 | 1 276 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 1 083 | 1 025 |
| по оплате труда | 635 | 4 986 | 4 255 |
| по лизинговым платежам | 636 | 80 | - |
| прочим кредиторам | 638 | 1 375 | 1 334 |
| Доходы будущих периодов | 650 | 77 317 | 65 371 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | 22 194 | 16 770 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **132 864** | **115 599** |
| **БАЛАНС** | **700** | **704 201** | **644 199** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2015 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2015 г. | За январь–декабрь 2014 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 376 276 | 351 888 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (339 866) | (309 629) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 36 410 | 42 259 |
| Управленческие расходы | 040 | (6 425) | (5 049) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 29 985 | 37 210 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 46 993 | 103 803 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (60 123) | (111 757) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 16 855 | 29 256 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 4 901 | 3 387 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 33 | 96 |
| проценты к получению | 103 | 3 618 | 2 364 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 1 250 | 927 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (735) | (182) |
| В том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (402) | (35) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (333) | (147) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 13 789 | 10 018 |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 13 081 | 9 832 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 708 | 186 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (10 028) | (9 250) |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (10 028) | (9 200) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | - | (50) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130) | 140 | 7 927 | 3 973 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 24 782 | 33 229 |
| Налог на прибыль | 160 | (5 524) | (7 400) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | (37) | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | 695 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (1 278) | (500) |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | 17 943 | 26 024 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 21 502 | 31 238 |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 39 445 | 57 262 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Количество акционеров – 89, в том числе – юридических лиц – 1, физических лиц – 88.
Количество простых (обыкновенных) акций – 450 341 штука.
Начислено на выплату дивидендов – 1 125 852 500 рублей.
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию, – 2 500 рублей.
Обеспеченность акции имуществом Общества на 01.01.2015 – 1,17 млн руб., на 31.12.2015 – 1,26 млн руб.
Количество акций, находящихся на балансе Общества, – 0 штук.
Среднесписочная численность работающих – 1399 человек.
30.03.2016 проведено годовое общее собрание акционеров, на котором утвержден годовой бухгалтерский баланс. Общество руководствуется правилами корпоративного поведения.
Данные годового отчета подтверждены аудиторским заключением ООО «Аудит-БизнесКонсалт», свидетельство о государственной регистрации № 190643165.
Генеральный директор И.Ф. Аверченко
Главный бухгалтер М.А. Климович

## Информация о финансово-хозяйственной деятельности за 2015 год открытого акционерного общества

# «Бобруйскобщепит»

Организация (наименование эмитента): Открытое акционерное общество «Бобруйскобщепит»
Учетный номер плательщика: 700090055
Вид экономической деятельности: сдача внаем недвижимого имущества
Организационно-правовая форма: открытое акционерное общество
Орган управления: без ведомственной подчиненности
Единица измерения: млн руб.
Адрес: г. Бобруйск, ул. Комсомольская, 25

| АКТИВЫ | На 31.12. 2015 г. | На 31.12. 2014 г. |
|---|---|---|
| 1 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | |
| Основные средства | 658 | 5 096 |
| Нематериальные активы | - | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 7 975 | 8 153 |
| В том числе: | | |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 7 975 | 8 331 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 161 | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **8 794** | **13 249** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | |
| Запасы | 28 | 119 |
| В том числе: материалы | 28 | 52 |
| товары отгруженные | - | 67 |
| прочие запасы | - | - |
| Расходы будущих периодов | 1 | 1 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 487 | 522 |
| Краткосрочные финансовые вложения | - | 204 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 36 | 86 |
| Прочие краткосрочные активы | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **552** | **932** |
| **БАЛАНС** | **9 346** | **14 181** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | |
| Уставный капитал | 107 | 157 |
| Добавочный капитал | 9 787 | 14 100 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | (656) | (218) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | - | - |
| Целевое финансирование | - | 3 |
| **ИТОГО по разделу III** | **9 238** | **14 042** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | - | - |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 108 | 139 |
| В том числе: | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 2 | 15 |
| по авансам полученным | 27 | 28 |
| по налогам и сборам | 9 | 38 |
| по социальному страхованию и обеспечению | - | 14 |
| по оплате труда | 10 | 19 |
| по лизинговым платежам | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | - | - |
| прочим кредиторам | 60 | 25 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **108** | **139** |
| **БАЛАНС** | **9 346** | **14 181** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2015 года

| Наименование показателей | За январь–декабрь 2015 г. | За январь–декабрь 2014 г. |
|---|---|---|
| 1 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 1 968 | 1 645 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | (1 921) | (1 794) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 47 | (149) |
| Управленческие расходы | - | - |
| Расходы на реализацию | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 47 | (149) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 557 | 544 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | (936) | (515) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | (332) | (120) |
| Расходы по инвестиционной деятельности | (52) | (10) |
| В том числе: | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | (52) | (10) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140) | (52) | (10) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150) | (384) | (130) |
| Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200) | (384) | (130) |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | - | (88) |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | (384) | (218) |

**Отдельные финансовые результаты**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | млн руб. | 1968,00 | 1645 |
| Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | млн руб. | 1921,00 | 1794 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения, всего | млн руб. | -384,0 | -130,0 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | млн руб. | 47,0 | -149,0 |
| в том числе: прочие доходы и расходы по текущей деятельности | млн руб. | -379,00 | 29,00 |
| в том числе: прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | млн руб. | -52,00 | -10 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | млн руб. | 0,00 | 0 |
| Чистая прибыль (убыток) | млн руб. | -384,0 | -130,0 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | млн руб. | -656,00 | -218 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | млн руб. | 0,00 | 0,00 |
| Долгосрочные обязательства | млн руб. | 0,00 | 0,00 |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 2 | 4 |
| Количество акционеров, всего | лиц | 557 | 566 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 0 | 2 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 557 | 564 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 0,00 | 0,22 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | млн руб. | 0,00 | 0,22 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,00 | 13,70 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,00 | 13,70 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. руб. | 219,73 | 230,61 |
| Доля государства в уставном фонде эмитента | всего в % | 0,00 | 31,34 |

Дата проведения годового общего собрания акционеров: 29.03.2016 г.
Правила корпоративного поведения в 2015 г. не применялись

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62

**Продавец: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. М. Горького, 62, (029)896-47-55, (029) 714-50-17, alex-68.06@mail.ru**

Лот №1. Линия по производству геотекстильных материалов: Линия пропитки фирмы «Ontec», инв. №145052, 2012 г.в.э., Ткацкая машина фирмы «Dornier» (Дорнье), инв. №145050, 2012 г.в.э., Шпулярник фирмы «Texmer» инв. №145053, 2012 г.в.э. Нач. цена: 4 158 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 415 800 000 бел. руб. Шаг аукциона – 207 900 000 бел. руб.

Лот №2. Грузовой фургон тентовый МАЗ 5336 А5-321, рег. знак АВ 8019-2, 2009 г.в., цвет белый. Нач. цена: 75 600 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 7 560 000 бел. руб. Шаг аукциона – 3 780 000 бел. руб.

Лот №3. Прицеп тентовый МАЗ 837810-014, рег. знак 2449 АА-2, 2009 г.в., цвет светло-серый. Нач. цена: 26 400 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 640 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 320 000 бел. руб.

Повторные торги состоятся **02.05.2016 в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 14.04.2016 с 8.30 по 29.04.2016 до 16.30.** Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с №3012411521014 (бел. руб.), №3012411521812 (RUB), №3012411521519 (USD), №3012411521522 (EUR) в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., МФО 739, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 62. Извещение о проведении аукционов опубликовано в газете «Звязда» 13.01.2016.

**Продавец: ОАО «КУПЦОВЪ», Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 1, (029) 509-02-27.**

Лот №1. Капитальное строение с инв. №220/С-11460, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 127, общей площадью 58,3 кв.м, наименование – проходная-весовая. Капитальное строение с инв. №220/С-11455, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, 127, общей площадью 1242,9 кв.м, наименование – капустохранилище. Нач. цена: 200 414 640 бел. руб. без НДС. Задаток: 20 041 500 бел. руб. Шаг аукциона – 10 021 000 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инв. №220/С-11452, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д.124, общей площадью 1799,2 кв.м, наименование – овощехранилище (картофелехранилище). Нач. цена: 328 941 420 бел. руб. без НДС. Задаток: 32 894 200 бел. руб. Шаг аукциона – 16 448 000 бел. руб.

Лот №3. Капитальное строение с инв. № 220/С-11459, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д.127, общей площадью 14,4 кв.м, наименование – подстанция подсобного хозяйства. Нач. цена: 4 356 840 бел. руб. без НДС. Задаток: 435 700 бел. руб. Шаг аукциона – 218 000 бел. руб.

Лот №4. Капитальное строение с инв. №220/С-11329, площадью 123,7 кв.м, наименование – мазутонасосная, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д.1 на зем. участке с кадастровым №221550100010000444 площадью 0,1098 га. Капитальное строение с инв. №220/С-11325, площадью 49,4 кв.м, наименование – старая проходная, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д.1 на земельном участке с кадастровым № 221550100010000442 площадью 0,0788 га. Нач. цена: 423 638 490 бел. руб. без НДС. Задаток: 42 363 900 бел. руб. Шаг аукциона – 21 182 000 бел. руб.

Лот №5. Грузовой фургон МАЗ 43704 3, цвет белый, рег. знак АВ 5951-2, 2008 г. в. Нач. цена: 13 430 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 343 000 бел. руб. Шаг аукциона – 672 000 бел. руб.

Лот №6. Грузовой фургон GAZ-3309, цвет белый, рег. знак АЕ 2323-2, 2010 г. в. Нач. цена: 9 620 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 962 000 бел. руб. Шаг аукциона – 481 000 бел. руб.

Лот №7. Грузовой специальный самосвал SAZ-3507, цвет голубой, рег. знак АА 4577-2, 1988 г. в. Нач. цена: 2 440 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 244 000 бел. руб. Шаг аукциона – 122 000 бел. руб.

Лот №8. Грузовой специальный самосвал SAZ-3507, цвет синий, рег. знак АВ 1360-2, 1991 г. в. Нач. цена: 4 210 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 421 000 бел. руб. Шаг аукциона – 211 000 бел. руб.

Лот №9. Грузовой фургон GAZ-33021, цвет светло-серый, рег. знак АВ 6061-2, 1997 г. в. Нач. цена: 2 440 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 244 000 бел. руб. Шаг аукциона – 122 000 бел. руб.

Лот №10. Грузовой бортовой UAZ-3303, цвет зеленый, рег. знак 1091ВТР, 1991 г. в. Нач. цена: 2 570 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 257 000 бел. руб. Шаг аукциона – 129 000 бел. руб.

Лот №11. Автобус вагон PAZ 3205, цвет белый, рег. знак АВ 1518-2, 1993 г. в. Нач. цена: 5 680 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 568 000 бел. руб. Шаг аукциона – 284 000 бел. руб.

Лот №12. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №42. Нач. цена: 6 250 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 625 000 бел. руб. Шаг аукциона – 313 000 бел. руб.

Лот №13. Агрегат комбинированный широкозахватный АКШ-7,2, инв. №48. Нач. цена: 4 730 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 473 000 бел. руб. Шаг аукциона – 237 000 бел. руб.

Лот №14. Сеялка зерновая Directa 400 Corsa, инв. №592. Нач. цена: 27 070 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 707 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 354 000 бел. руб.

Лот №15. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №1711. Нач. цена: 6 250 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 625 000 бел. руб. Шаг аукциона – 313 000 бел. руб.

Лот №16. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №6108. Нач. цена: 6 250 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 625 000 бел. руб. Шаг аукциона – 313 000 бел. руб.

Лот №17. Сеялка механическая навесная СМН-12, инв. №7003. Нач. цена: 5 730 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 573 000 бел. руб. Шаг аукциона – 287 000 бел. руб.

Лот №18. Культиватор-опрыскиватель универсальный КОУ-4/6, инв. №7700. Нач. цена: 2 890 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 289 000 бел. руб. Шаг аукциона – 145 000 бел. руб.

Лот №19. Агрегат комбинированный посевной АКП-4, инв. №9042. Нач. цена: 6 050 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 605 000 бел. руб. Шаг аукциона – 303 000 бел. руб.

Лот №20. Опрыскиватель прицепной штанговый Мекосан 2500-18, инв. №9045. Нач. цена: 8 110 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 811 000 бел. руб. Шаг аукциона – 406 000 бел. руб.

Лот №21. Машина моечная лопастная Т1-КУМ-3 инв. №414. Нач. цена: 4 710 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 471 000 бел. руб. Шаг аукциона – 236 000 бел. руб.

Лот №22. Машина моечная лопастная Т1-КУМ-3 инв. №415. Нач. цена: 3 650 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 365 000 бел. руб. Шаг аукциона – 183 000 бел. руб.

Лот №23. Машина термоусадочная Profipack PR700, инв. №2012. Нач. цена: 3 110 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 311 000 бел. руб. Шаг аукциона – 156 000 бел. руб.

Лот №24. Насос Ж-6 ВНП 1032, инв. №447. Нач. цена: 4 280 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 428 000 бел. руб. Шаг аукциона – 214 000 бел. руб.

Лот №25. Насос Ж-6 ВНП 1032, инв. №2125. Нач. цена: 2 080 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 208 000 бел. руб. Шаг аукциона – 104 000 бел. руб.

Лот №26. Машина шинковальная РСНС КИМ, инв. №1051. Нач. цена: 3 880 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 388 000 бел. руб. Шаг аукциона – 194 000 бел. руб.

Лот №27. Теплообменник (шпаритель), инв. №501. Нач. цена: 8 980 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 898 000 бел. руб. Шаг аукциона – 449 000 бел. руб.

